ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ПЯТНІЦА, 3 САКАВІКА 1939 г. № 12 (426)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

НАДЗЕЖДА КАНСТАНЦІНАЎНА КРУПСКАЯ

АД ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ЎСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў) І СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ СССР

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў) і Совет Народных Камісараў СССР з глыбокім смуткам паведамляюць партыю, рабочы клас і ўсіх працоўных, што 27 лютага, у 6 гадзін 15 мінут раніцы, у Маскве, пасля цяжкай хваробы памёрла старэйшы член партыі, бліжэйшы памочнік В. І. Леніна, член ЦК ВКП(б), дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Н. К. Крупская.

Смерць тав. Крупскай, якая аддала ўсё сваё жыццё справе комунізма, з'яўляецца вялікай утратай для партыі і працоўных Саюза ССР.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў). СОВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ СССР.

СТРАСНЫ БАРАЦЬБІТ ЗА КОМУНІЗМ

Крэпам апавіты сцягі... Смутак агарнуў краіну... Цяжкая вестка прышла 27 лютага — памёрла Надзежда Канстанцінаўна Крупская. А толькі напярэдадні — 26 лютага — радасна адзначыў совецкі народ сямідзесяцігоддзе Надзежды Канстанцінаўны, выдатны юбілей яе слаўнага жыцця.

Надзежда Канстанцінаўна Крупская, — гэта імя неразрыўна звязана з імем генія чалавецтва Владзіміра Ільіча Леніна. Старэйшы большэвік, верная падруга і памочніца вялікага Леніна, любіміца партыі і працоўнага народа, яна прайшла слаўны шлях рэволюцыянера, барацьбіта за комунізм.

Вырасшая і выхаваная ў рэволюцыйным асяроддзі, Надзежда Канстанцінаўна маладой дзяўчынай уключылася ў рэволюцыйны рух, прайшла разам з рабочым класам увесь шлях барацьбы за стварэнне большэвіцкай партыі, прайшла ў радах партыі ўвесь шлях барацьбы за ўрачыстасць соцыялізма і разам з намі, разам з усёй совецкай краінай натхнёна рыхтавалася да XVIII з'езда партыі Леніна — Сталіна.

У 1890 годзе Надзежда Канстанцінаўна ўступіла ў марксісцкі гурток. Потым яна — з 1891 да 1896 года — настаўніца вячэрне-нядзельнай рабочай школы ў Пецербургу. «Гэтыя годы, — успамінала Надзежда Канстанцінаўна, — супалі з гадамі, калі ў мяне складваўся і ўмацоўваўся рэволюцыйны светапогляд. Як толькі стала раскрывацца прада мною роля, якую рабочы клас павінен адыграць у справе вызвалення ўсіх працоўных, дык нястрымна пацягнула мяне ў рабочае асяроддзе, да работы сярод рабочых».

І Надзежда Канстанцінаўна ўваходзіць у створаны Леніным «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа», актыўна ўключаецца ў рэволюцыйную дзейнасць, цалкам аддае сябе справе барацьбы рабочага класа, служэнню вялікім ідэям комунізма.

Турмы і ссылкі, эміграцыя, работа ў падполлі — такі суровы шлях прафесіянала-рэволюцыянера прайшла Надзежда Канстанцінаўна, ніколі не губляючы бадзёрасці і ўпэўненасці ў перамогу рабочага класа.

Рэволюцыянер-прапагандыст, сакратар ленінскай «Искры», сакратар большэвіцкага ЦК у перыяд 1905 года, выдатны публіцыст, актыўны дзеяч партыі ў перыяд Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, страсны будаўнік соцыялізма — вось рэволюцыйны шлях Надзежды Канстанцінаўны.

З першых дзён перамогі Вялікага Кастрычніка Надзежда Канстанцінаўна аддае ўсе свае сілы справе комуністычнай асветы працоўных. Выдатны дзеяч на фронце народнай асветы, яна звыш 21 года нязменна была на пасту члена калегіі Наркамасветы, а потым намеснікам наркома асветы РСФСР.

Верная падруга В. І. Леніна, яна да апошняй хвіліны яго жыцця была поруч з ім, дзяліла з ім радасць і гора.

І пасля смерці В. І. Леніна Надзежда Канстанцінаўна ў радах большэвіцкай партыі пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна нястомна і непахісна, мужна і самаадданна да апошняга ўдару свайго сэрца змагалася за справу Леніна — Сталіна, за комунізм.

Выступаючы напярэдадні выбараў у Вярхоўны Совет СССР, Надзежда Канстанцінаўна гаварыла:

«На маю долю выпала вялікае шчасце быць членам нашай большэвіцкай партыі, працаваць пад кіраўніцтвам таварыша Леніна, працаваць пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна. На маю долю выпала вялікае шчасце бачыць, як наша краіна з краіны цёмнай, з краіны беднай, з краіны, стаптанай царызмам, памешчыкамі і капіталістамі, ператварылася ў краіну соцыялізма».

Яна горача любіла сваю краіну, свой вялікі народ і глыбока ненавідзела ворагаў. Яна гаварыла: «Глыбокую нянавісць і агіду да трацкісцка-бухарынскіх шпіёнаў і дыверсантаў адчувае наш народ. Іншага пачуцця да ворагаў у нас быць не можа». Яна заклікала совецкі народ «...аберагаць, як зяніцу вока, перамогі соцыялізма ў нашай краіне».

Надзежда Канстанцінаўна Крупская, — гэта імя будзе заўсёды жыць у памяці совецкага народа. Светлы вобраз сумленнага і скромнага, мужнага і загартаванага большэвіка, цудоўны вобраз Надзежды Канстанцінаўны будзе жыць у вяках, як прыклад самааддананага служэння Партыі і Радзіме.

Квітненню нашай соцыялістычнай культуры, будаўніцтву яе аддала Надзежда Канстанцінаўна шмат год жыцця, свой талент і сілы. Плённа і шмат працавала Надзежда Канстанцінаўна ў галіне народнай асветы. Гэтай любімай справе яна, чалавек вялікай культуры і глыбокіх ведаў, аддала свае сілы з першых-жа дзён рэволюцыі.

Надзежда Канстанцінаўна — аўтар кніг і брашур па пытаннях народнай асветы, педагогікі, палітасветнай работы, клапатлівы друг і настаўнік работнікаў школ, клубаў, хат-чытальнь. Яна шмат зрабіла ў справе выхавання падрастаючага пакалення соцыялістычнай эпохі — комсамольцаў і піонераў, у справе фарміравання комуністычнай свядомасці новага чалавека нашай эпохі. За выдатную работу на фронце комуністычнай асветы Надзежда Канстанцінаўна ўзнагароджана ордэнам Леніна і ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Надзежда Канстанцінаўна — старэйшы і актыўнейшы дзеяч міжнароднага жаночага руху. Яна шмат зрабіла ў галіне вызвалення і комуністычнага выхавання работніц і сялянак. Яе пяру належаць шматлікія працы па пытаннях работы сярод жанчын.

Надзежда Канстанцінаўна — бліскучы публіцыст і аўтар выдатных кніг аб жыцці і дзейнасці Владзіміра Ільіча Леніна. Гэтыя кнігі вучаць совецкіх пісьменнікаў праўдзівасці і страснасці, партыйнай прынцыповасці.

Надзежда Канстанцінаўна — непахісны большэвік. Яна заўсёды ва ўсю сваю работу ўносіла дух партыйнасці, дух ленінізма, нястомна змагалася за магутнасць і адзінства радоў большэвіцкай партыі.

Прайшоўшы з партыяй яе гераічны шлях, Надзежда Канстанцінаўна — член ЦК Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў), дэпутат Вярхоўнага Совета СССР — аддала ўсе свае сілы на карысць совецкага народа, які пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна ажыццяўляе вялікія заветы Владзіміра Ільіча.

Перастала біцца сэрца любімай дачкі совецкага народа. Абарвалася кіпучая дзейнасць актыўнага прапагандыста, агітатара, страснага барацьбіта за комунізм — Надзежды Канстанцінаўны. Схіляем сцягі, схіляем галовы над прахам старэйшага члена партыі, выдатнага чалавека нашай сталінскай эпохі. Цяжкую ўтрату панёс народ, панесла партыя. Няма з намі ў барацьбе за ажыццяўленне трэцяй сталінскай пяцігодкі Надзежды Канстанцінаўны Крупскай. Але неўміруча і непераможна справа, якой верна поўвека служыла Надзежда Канстанцінаўна, якой аддала яна сваё цудоўнае жыццё большэвіка. Совецкі народ, згуртаваны вакол партыі Леніна—Сталіна, вакол вялікага правадыра таварыша Сталіна, па ленінскаму шляху ўпэўнена ідзе ад перамогі да перамогі, ідзе к комунізму.

АД ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР з глыбокім смуткам паведамляе аб смерці старэйшага і адданейшага члена ВКП(б), няўтомнага барацьбіта за справу комунізма, вернага друга і саратніка вялікага Леніна, Члена Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР тав. НАДЗЕЖДЫ КАНСТАНЦІНАЎНЫ КРУПСКАЙ

АД ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА КОМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА

Выканаўчы Камітэт Комуністычнага Інтэрнацыянала выражае глыбокі смутак па поваду смерці старэйшага большэвіка, бліжэйшага памочніка і друга вялікага Леніна, члена Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) — Надзежды Канстанцінаўны **Крупскай.**

Смерць Надзежды Канстанцінаўны Крупскай—гэта цяжкая ўтрата не толькі для совецкага народа, але і для працоўных ўсяго свету, бо ўсё жыццё цудоўнага чалавека, прафесіянальнага рэволюцыянера; адданейшага члена партыі Леніна — Сталіна Надзежды Канстанцінаўны Крупскай назаўсёды астанецца вялікім прыкладам для кожнага барацьбіта за соцыялізм і комунізм, супроць фашызма, капіталізма і вайны.

У асобе Надзежды Канстанцінаўны Крупскай працоўныя жанчыны ўсіх краін страцілі вялікага друга і стойкага барацьбіта за разняволенне жанчыны, за вызваленне мільёнаў працоўных жанчын і работніц ва ўсім свеце ад рабства капіталістычнай эксплуатацыі.

У гэтыя цяжкія гадзіны Комуністычны Інтэрнацыянал выражае цвёрдую ўпэўненасць у блізкім таржастве той справы, якой было аддана ўсё выдатнае жыццё Надзежды Канстанцінаўны Крупскай — справе вызвалення ўсяго працоўнага чалавецтва ад капіталістычнага гнёту і бяспраўя, справе Леніна — Сталіна, справе таржаства комунізма ва ўсім свеце.

ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ КОМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА.

АД ЦК КП(б)Б і СНК БССР

Цэнтральны Камітэт комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі і Соўнаркам Беларускай ССР глыбока смуткуюць з поваду смерці старэйшага члена большэвіцкай партыі, нястомнага барацьбіта за справу комунізма, бліжэйшага друга і саратніка Леніна, члена ЦК ВКП(б), дэпутата і члена Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР—таварыша **Надзежды Канстанцінаўны Крупскай.**

Смерць тав. Крупскай з'яўляецца вялікай утратай для партыі і ўсіх працоўных Совецкага Саюза.

Надзежда Канстанцінаўна Крупская аддала сваё слаўнае жыццё за справу вызвалення рабочага класа ад гнёту эксплуататараў, за таржаство ідэй Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна.

Бязмежная адданасць партыі, гераічнае рэволюцыйнае жыццё і самаадданая работа Надзежды Канстанцінаўны будуць служыць прыкладам для мільёнаў працоўных у іх барацьбе за комунізм.

ЦК КП(б)Б. СНК БССР.

Ад Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР

Прэзідыум Вярхоўнага Совета Беларускай ССР разам з усёй партыяй і народам Совецкага Саюза выражае глыбокі смутак па поваду смерці бліжэйшага друга Владзіміра Ільіча Леніна, старэйшага члена нашай партыі, адданага барацьбіта за справу комунізма, члена ЦК ВКП(б), члена Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР — Надзежды Канстанцінаўны **Крупскай.**

ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР.

Жыццё Н. К. Крупскай—прыклад для моладзі

Паведамленне аб смерці старэйшага члена партыі Леніна—Сталіна, бліжэйшага друга вялікага Леніна — Надзежды Канстанцінаўны Крупскай напоўніла глыбокім смуткам сэрцы совецкай моладзі.

Надзежда Канстанцінаўна мацярынскай любоўю любіла дзяцей, моладзь. Яна страсна заклікала моладзь упарта працаваць над асваеннем марксізма-ленінізма, па-большэвіцку дапамагаць партыі і ўраду прывесці Совецкі Саюз да таржаства комунізма.

Совецкая моладзь, як і ўвесь совецкі народ, ніколі не забудзе Надзежду Канстанцінаўну. Яе гераічнае рэволюцыйнае жыццё будзе прыкладам для моладзі ў барацьбе за справу Леніна—Сталіна, за справу, за якую так палка змагалася Надзежда Канстанцінаўна Крупская.

ЦК ЛКСМБ.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ХВАРОБЕ тав. КРУПСКАЙ Н. К.

У Надзежды Канстанцінаўны з 1912 г. была базедава хвароба, якая выклікала захворванне сэрца. З 1919 г. перыядычна паўтараліся з'явы недастатковасці сэрца з пастаяннай адышкай. За апошнія годы ўсё больш і больш выяўляліся прыкметы парушэння абмену вяшчэстваў і агульнага артэрыёсклероза.

Па свайму звычаю Надзежда Канстанцінаўна 23 лютага выехала на адпачынак за горад. 24 лютага раптоўна ў яе паявіліся рэзкія болі ў жываце. Болі былі настолькі моцныя і агульнае становішча настолькі цяжкае, што прыбыўшыя неўзабаве ўрачы палічылі патрэбным неадкладна перавезці Надзежду Канстанцінаўну ў Крэмлёўскую больніцу. У больніцы высвеілася, што ў Надзежды Канстанцінаўны ёсць ачаг запалення ў брушной поласці ў сувязі з закупоркай склерազіраваных сасудаў кішэчніка. Вынікам закупоркі з'явілася амяртвенне часткі кішэчніка і наступнае агульнае запаленне брушыны.

Хвароба развівалася бурна і з самага пачатку суправаджалася рэзкім упадкам сардэчнай дзейнасці і стратай прытомнасці. У сувязі з гэтым адпадала магчымасць дапамагчы хворай аперацыйным шляхам. Хвароба быстра прагрэсіравала, і 27 лютага ў 6 гадзін 15 мінут раніцы паследвала смерць.

Ускрыццем, зробленым акадэмікам А. І. Абрыкосавым, устаноўлена, што асноўнай хваробай Надзежды Канстанцінаўны з'яўляўся агульны артэрыёсклероз, на глебе якога развілася закупорка кровеноснага сасуда, амяртвенне тонкай кішкі і агульнае запаленне брушыны.

Заслуж. дзеяч навукі праф. СПАСАКУКОЦКІ.
Прафесар ВІНАГРАДАЎ.
Прафесар ОЧКІН.
Дацэнт КОГАН М. Б.
Начальнік Лечсанупра Крэмля БУСАЛАЎ.

Ад Прэзідыума Усесаюзнага Цэнтральнага Совета Прафесіянальных Саюзаў

Прэзідыум Усесаюзнага Цэнтральнага Совета Прафесіянальных Саюзаў выражае глыбокі смутак з прычыны заўчаснай смерці старога большэвіка, бліжэйшага друга і саратніка таварыша Леніна—**Надзежды Канстанцінаўны Крупскай.**

Надзежда Канстанцінаўна Крупская аддала ўсё сваё слаўнае і яркае жыццё за справу вызвалення рабочага класа ад гнёту і эксплуатацыі, за таржаство вялікіх ідэй марксізма-ленінізма.

Увесь свой жыццёвы шлях яна прайшла з рабочым класам і яго партыяй, беззаветна змагалася пад сцягам Леніна — Сталіна за канчатковую перамогу комунізма.

Бязмежная адданасць партыі, нястомная, самаадданая работа на карысць працоўных Надзежды Канстанцінаўны Крупскай будуць служыць прыкладам для мільёнаў працоўных у іх вялікай барацьбе за комунізм.

ПРЭЗІДЫУМ ВЦСПС.

Ад Народнага Камісарыята Асветы РСФСР

Народны Камісарыят Асветы, партыйныя і грамадскія арганізацыі Наркамата з глыбокім смуткам паведамляюць рабочых, сялян і ўсіх працоўных аб паследваўшай 27 лютага 1939 года смерці старога большэвіка, арганізатара народнай асветы, вернага друга і таварыша Владзіміра Ільіча Леніна, беззаветна адданага барацьбіта за справу комунізма — намесніка народнага камісара асветы Надзежды Канстанцінаўны Крупскай.

Народны Камісарыят Асветы РСФСР разам з усімі працоўнымі нашай краіны, смуткуючы аб цяжкай утраце палкага рэволюцыянера - большэвіка, актыўнейшага арганізатара комуністычнай асветы мас, выражае цвёрдую ўпэўненасць у тым, што выдатнае жыццё Н. К. Крупскай — рэволюцыйнага барацьбіта—будзе служыць прыкладам для ўсіх работнікаў народнай асветы і працоўных нашай вялікай радзімы.

Вялікі прапагандыст ідэй комунізма

Пісьменнікі БССР разам з усім совецкім народам глыбока смуткуюць з поваду смерці старэйшага члена большэвіцкай партыі, бліжэйшага друга Владзіміра Ільіча Леніна — Надзежды Канстанцінаўны Крупскай.

Усё сваё слаўнае жыццё Надзежда Канстанцінаўна аддала служэнню вялікай справе партыі Леніна—Сталіна, справе комунізма. Верная дачка народа, яна прайшла разам з рабочым класам увесь яго шлях барацьбы за стварэнне большэвіцкай партыі і ў радах гэтай партыі самаадданна змагалася за перамогу соцыялізма.

Надзежда Канстанцінаўна была выдатным дзеячом соцыялістычнай культуры. З першых-жа дзён перамогі Вялікага Кастрычніка яна аддала свае сілы справе комуністычнай асветы працоўных, справе выхавання падрастаючага пакалення соцыялістычнай эпохі, справе фарміравання комуністычнай свядомасці новага чалавека.

У нашай совецкай літаратуры жывуць і будуць жыць кнігі Надзежды Канстанцінаўны пра вялікага Леніна, усе яе творы, якія вучаць нас глыбіні марксісцкага аналізу з'яў, партыйнай прынцыповасці.

Лепшай памяццю аб Надзежде Канстанцінаўне будзе ўзмацненне нашай работы па авалоданню марксізмам-ленінізмам, па прапагандзе ідэй вялікай партыі Леніна—Сталіна, па ўзняццю якасці совецкай літаратуры, па напісанню твораў, годных вялікай Сталінскай эпохі.

Агульны сход пісьменнікаў гор. Менска і супрацоўнікаў апарата ССП БССР.

ПАХАВАННЕ Н. К. КРУПСКАЙ

МАСКВА, 2 сакавіка. Сёння чырвоная сталіца хавала Надзежду Канстанцінаўну Крупскую.

Як і напярэдадні, аддаць ёй апошні доўг у Калонную залу Дома саюзаў прышлі тысячы працоўных. Развітацца з прахам старэйшага большэвіка прышлі дэлегаты VII маскоўскай абласной і VI гарадской аб'яднанай канферэнцыі ВКП(б).

Доступ да урны з прахам пакойнай быў спынен ў 15 гадзін 30 мінут. Пасля гэтага ў зале асталіся толькі бліжэйшыя прыяцелі Надзежды Канстанцінаўны.

У 16 гадзін 30 мінут таварышы Н. А. Булганін, М. М. Літвінаў, Н. М. Швернік, Емельян Яраслаўскі, М. М. Кагановіч, Г. І. Петроўскі, Л. З. Мехліс, С. М. Будзённы, Г. І. Кулік, А. Д. Лакціёнаў паднялі катафалк з урнай і панеслі яго ад Дома саюзаў па Охотнаму раду, дзе выстраіўся пачотны воінскі эскорт.

Красную плошчу запоўнілі дэлегацыі працоўных сталіцы. У велічнай цішыні развітваўся совецкі народ са сваёй дастойнай дачкой. У знак смутку многатысячныя калоны прыспусцілі чырвоныя сцягі, акаймлёныя жалобнымі стужкамі.

У 17 гадзін жалобны катафалк быў устаноўлен на пастамент перад маўзалеем Леніна. На трыбуне маўзалея — таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, Л. М. Кагановіч, К. Е. Варашылаў, М. І. Калінін, А. І. Мікаян, А. А. Андрэеў, Н. М. Швернік, Н. А. Булганін, А. Ф. Горкін, О. Ф. Леонава.

Жалобны сход адкрыў сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР тав. А. Ф. Горкін. Ад імені ЦК ВКП(б) і Урада СССР выступае Н. М. Швернік. Ад партыйных, совецкіх арганізацый і працоўных Масквы развітальную прамову гаворыць сакратар МК і МГК ВКП(б) тав. А. С. Шчэрбакоў. Дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, дырэктар школы № 175 Свердлоўскага раёна Масквы, О. Ф. Леонава гаворыць прамову ад імені мільёнаў работнікаў асветы і совецкай інтэлігенцыі.

Па сканчэнні жалобнага схода таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, Л. М. Кагановіч, К. Е. Варашылаў, М. І. Калінін, А. І. Мікаян, А. А. Андрэеў, М. Ф. Шкіратаў, Емельян Яраслаўскі, А. С. Шчэрбакоў беражліва паднялі жалобны катафалк з урнай і панеслі яго да Крэмлёўскай сцяны, якая назаўсёды прыняла прах старэйшага члена большэвіцкай партыі, бліжэйшага друга і памочніка Леніна, члена ЦК ВКП(б) і Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР Н. К. Крупскай. (ТАСС)

ШЭЎЧЭНКА І БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ

Якуб КОЛАС

Простая, хвалюючая дэталь з жыцця вялікага паэта: хлопчык-падлетак гадоў 15—16 у ліку дваровых памешчыка Энгельгардта, царскага чыноўніка, ідзе пехатой «па этапу» з Варшавы ў Пецербург. Пан паехаў у карэце, а чэлядзь ідзе пехатой — навошта пану лішнія расходы? Хлопчык-падлетак прызначан для паслугі памешчыку-самадуру. На адной назе ў хлопчыка бот, другая нага босая. Яго разумны, удумлівы погляд спыняецца на малюнках прыроды Польшчы і Літвы, на мяккіх і рознастайных пейзажах Беларусі, якія так часта змяняюцца. Ён нясе ў сваім сэрцы нейкую затоеную, цяжкую думку. Дзесь далёка засталася яго родная, мілая краіна. Яна саграва́ла яго бязрадаснае маленства лагодным украінскім сонцам. Ён не ведае, куды ён ідзе і куды ваогул заняce яго суровы лёс. На фоне дарожных малюнкаў і спатканняў з новымі людзьмі, з незнаёмымі паселішчамі і гарадамі ён усюды бачыць адну агульную з'яву: заняволены, як і ён сам, народ і яго прыгнятальнікаў, беднасць і раскошу, няволю і сваволле. Ён услухоўваецца ў гутарку, у расказы, у песні і думы народа, у якіх так моцна гучыць адвечнае гора і нянавісць да паноў і чыноўнікаў. Яго маладое, чулае сэрца, у якім злучыліся мільёны сэрцаў вялікага працоўнага народа, прагна ўбірае ў сябе гэта гора і нянавісць, гэтыя мары і надзеі народа, як убірае высушаная сухавеем зямля жыватворчую вільгаць навальнічных дажджоў. У блуканнях і дарогах з самага ранняга маленства назірае жыццё юны Тарас Шэўчэнка, геніяльны кабзар украінскага народа. Так накапліваецца яго жыццёвы вопыт, так стварaецца крыніца яго чаруючай, своеасаблівай паэзіі, неадлучна злітай з паэзіяй народа. Гэтым назіраннем народнага гора, гнёту і бяспраўя, пратэсту і нянавісці да прыгнятальнікаў азначаецца асноўны тон і характар яго паэзіі.

Паэзія гэта блізкая і зразумелая і для беларускага народа, бо-ж так многа агульнага і падобнага ў гістарычным лёсе беларусаў і украінцаў. І адны і другія ў аднолькавай ступені адчувалі гнёт літоўскіх князёў і польскіх каралёў. Адны і другія на працягу доўгіх стагоддзяў сумесна змагаліся з сваімі прыгнятальнікамі, польскімі памешчыкамі і магнатамі. Цэлы рад сялянскіх паўстанняў на Украіне і Беларусі ішоў побач і рука ў руку. Так, у паўднёвай часці Беларусі, сумежнай з Украінай, сяляне сабралі вялікі «загон» (атрад), на чале якога стаў украінец Нябаба. Яны палілі і грамілі панскія сядзібы і касцёлы. Разам з украінцамі змагаліся беларускія сяляне пад кіраўніцтвам Няпаліча, Хвесько, Міхненка, Крывашапкі і Гаркушы. Гераічна біліся яны разам з украінскімі казакамі пад Пінскам, Мозырам і Бабруйскам. Яны гінулі ў няроўнай барацьбе з Польшчай. Для іх была лепей смерць, чым панскія здзекі і няволя. Славутая Запарожская Сеч, дзе галеча, цяглавыя людзі знаходзілі прытулак і схоў ад непасільнага гнёту сваіх прыцясніцеляў, як абяцаная зямля, вабіла да сябе непакорных людзей, што шукалі волі, не толькі з Украіны, але і з Беларусі. Соцыяльнае бяспраўе і нацыянальны гнёт царскага самадзяржаўя з аднолькавай сілай клаліся на украінскі і беларускі працоўны народ. Гэта пастаянная гістарычная сувязь, гэта падабенства гістарычных умоў двух народаў і іх моўная блізасцьналажылі адбітак прыязні ў іх узаемаадносінах. Гэта-ж агульнасць гістарычнага лёсу і інтарэсаў параджала і агульныя матывы народнай творчасці. Вось чаму паэзія Шэўчэнка, якая выцякала непасрэдна з жывых крыніц фальклору і асабістага назірання жыцця, глыбока рэвалюцыйная па сваёй сутнасці, шчырая і простая па форме, так горача ўспрымалася працоўнымі масамі беларускага народа і знаходзіла жывы водгук у яго сэрцы. Многія творы геніяльнага украінскага кабзара, песняра і трыбуна прыгнечанага народа, мелі шырокае распаўсюджанне сярод беларускага народа і, натуральна, уваходзілі ў залаты фонд яго творчасці. Народны паэт Беларусі Янка Купала ўпершыню пазнаёміўся з паэзіяй Шэўчэнка з вуснаў свайго народа. Яшчэ ў дзіцячыя годы запомніў ён песню кабзара з паэмы Шэўчэнка «Гайдамакі», не ведаючы яе аўтара:

От села до села
Танці та музыкі...

У дарэвалюцыйныя часы сярод вучнёўскай беларускай моладзі і інтэлігенцыі, вышаўшай з гушчы працоўнага народа, асабліва сярод сельскага настаўніцтва, песні Тараса Шэўчэнка былі надзвычай папулярны. Шырокаю вядомасцю карысталіся песні «Реве та стогне Дніпр широкий», «Заповіт», «Ой, одна я, одна» і інш. Тэкст гэтых песень, асобныя словы і выразы падпадалі некаторым зменам. Часамі украінскае слова замянялася беларускім, альбо вымаўлялася на беларускі лад. Некаторыя шэўчэнкаўскія песні выконваліся ў рускім тэксту, напрыклад, замест «Утоптала стежечку через яр» спявалі «Проторила я дорожку через яр». І словы і мелодыі гэтых песень заўсёды рабілі моцнае ўражанне як на саміх выканаўцаў, так і на слухачоў. Непадробленая шчырасць пачуцця, глыбокая народнасць гэтых песень, задушэўная прастата і цеплыня, часамі авеяныя нейкім чаруючым сумам, стваралі своеасаблівы настрой, моцна ўзрушалі і хвалявалі. Але захаплялася песнямі Шэўчэнка не толькі інтэлігенцыя, — іх спявалі ў народзе, змяніўшы іх згодна асаблівасцям сваёй мовы. Уплыў шэўчэнкаўскай паэзіі на вусную творчасць беларускага народа несумненны. Нажаль, нашы літаратуразнаўцы прайшлі міма гэтага факта і не даследвалі яго. Тым-жа часам шмат якія народныя беларускія песні ўна пераклікаюцца з многімі творамі геніяльнага украінскага паэта. Гэта — песні рэкруцкія, песні аб сірочай долі, чумацкія песні. Так, у Шэўчэнка ў паэме «Сава» сказана:

Ой, привезли да прыему
Чуприну голити

У беларускай песні:
Вязуць мяне да прыёму...
Ох, падбрылі, падгалілі,
На прасніцу пасадзілі...

У Шэўчэнка ў той-жа паэме:
Сталі хлопців
В кайданы кувати
Та повезли да приему
Битыми шляхами;
Пійшла й вдова з матерями
З дрібными зльозами.

У беларускай песні:
Той дарожанькай рэкрут вядуць
З калодкамі ды з замкнёнымі,
А за імі ўслед жонкі ідуць,
Ідуць жанкі ды з дзіцяткамі.

Такіх прыкладаў шмат, але і прыведзеных даволі, каб пераканацца ў блізасці творчасці беларускага народа да паэзіі Шэўчэнка.

Ці магла маладая беларуская паэзія, цела і кроў ад народнай творчасці, увабраўшая ў сябе ў асобе яе найболей відных прадстаўнікоў рэвалюцыйны і дэмакратычны дух яе, — ці магла яна не падупасці пад уплыў роднай ёй і па зместу і па форме творчасці геніяльнага украінскага паэта? Вядома, не. Ужо ў самых першых творах Якуба Коласа і Янкі Купалы адчуваецца гнеўны голас Тараса Шэўчэнка, калі яны выступаюць супроць царскага прыгнечання, супроць багачоў, якія нажываюцца і будуюць свой дабрабыт на непасільнай працы і ўбожастве працоўнага народа. У Тараса Шэўчэнка вучыліся яны знаходзіць гнеўныя і бязлітасныя словы, накіраваныя супроць прыгнятальнікаў народа. Вядомыя шэўчэнкаўскія вершы:

Думи мої, думи мої,
Лихо мені з вами!
Нащо стали на папері
Сумними рядами? —

выклікаюць цэлы рад аналагічных вершаў у беларускіх паэтаў. У Якуба Коласа:

Ой, вы, думкі, думкі,
Сэрца майго раны!
Ці вы мае дзеці,
Ці вы кім насланы?

У Янкі Купалы:
Песні мае, песні,
Смуткаў маіх дзеці!
Калі-ж вам час прыйдзе
Весела запеці?

Тыя-ж шэўчэнкаўскія матывы чуюцца і ў вершы Купалы «Да сваіх думак»:

Думкі, думкі весялушкі!
Скуль вы ўзяліся?
Што ў душы, як тыя птушкі,
Песняй завіліся?

На тых-жа матывах напісаны яго верш «Плачуць мае песні»:

Жудка стогнуць рэкі,
Узбуджаны вясною,
Плачуць мае песні,
Галосяць са мною.

У прыведзеных вершах уплыў шэўчэнкаўскіх «Дум» на творчасць названых паэтаў відавочны. Ён выражаецца не толькі ў шэўчэнкаўскіх матывах, але, як мы бачым, і ў самой форме. Гэты ўплыў ідзе шмат шырэй і глыбей. Найбольш поўна выяўляецца ён у дарэвалюцыйнай творчасці Янкі Купалы. Першыя дзве кніжкі сваіх вершаў Купала выдае пад назваю «Жалейка» і «Гусляр». У самых гэтых назвах адчуваецца пераклічка з шэўчэнкаўскім «Кабзаром». Шэўчэнка — любімы паэт Янкі Купалы. Тая зацікаўленасць, якую праяўляў і праяўляе Купала да вершаў геніяльнага кабзара, сведчыць аб гэтым. Яшчэ ў 1906 годзе ён першы ў беларускай літаратуры перакладае твор Тараса Шэўчэнка «Минают дні, минают ночи» на беларускую мову. У 1909 годзе, у дзень 95-годдзя з дня нараджэння вялікага паэта ён піша верш «Памяці Тараса Шэўчэнка» і сам сведчыць аб сваім захапленні паэзіяй Шэўчэнка і аб уплыве яе на беларускую паэзію:

І к нам тваё слоўка не раз далятала,
Мы слухалі ўцешна, што бае сусед.

У другім сваім вершы, таксама прысвечаным Шэўчэнку, ён піша:

Яго «бацькам» ахрысціла
Памятна Украіна.
Эх, і нам будзь бацькам мілым,
Украінча слаўны!
Плывучы ў даль, твая песня
Гаспінцам не вузкім
Найшла водгалас пачэсны
У сэрцы беларускім.

Праз свае пераклады з Шэўчэнка, над якімі Купала працуе даўно, ён пазнаёміў маладое пакаленне беларускіх паэтаў з паэзіяй вялікага украінскага паэта. І яны вучыліся паэтычнаму майстэрству ў Шэўчэнка. Адну з значных сваіх паэм, створаных у маладыя годы, Купала напісаў на украінскім матэрыяле, запазычыўшы яе сюжэт з запісаў беларускага фальклору. Паэма гэта называецца «Бандароўна». Дзея адбываецца на Украіне. Асноўныя героі паэмы — пан Патоцкі з Канева, дэспат і нястрыманы распуснік, і маладая красуня-казачка, дачка Бандарэнкі. У карчме гуляе казачая моладзь, у тым ліку і Бандароўна. Паяўляецца пан Патоцкі са сваімі гайдукамі. Ён звяртае ўвагу на Бандароўну і прыстае да яе. Абураная дзяўчына б'е пана па твары. Зняважаны пан Патоцкі ў ярасці выбягае склікаць сваю дружыну, каб адпомсціць казакам і Бандароўне за такую знявагу. Бандароўне раюць уцякаць і схавацца ад помсты Патоцкага. Яе ловяць гайдукі і прыводзяць да пана. Патоцкі паказвае раскошна накрыты стол і ўсё багацце панскага палаца. Узяўшы набітую куляй стрэльбу, ён пытаецца, што выбірае яна: ці жыць з ім у гэтай раскошы, ці быць забітай. Гордая Бандароўна адхіляе ўсё гэта багацце і пана разам з ім. Патоцкі забівае яе. Гэта дзікая расправа з Бандароўнай выклікае абурэнне і паўстанне народа супроць панскага гвалту і сваволства.

Задымілі у пажары
Панскія сялібы,
Палілася кроў ракою
На лугі, на скібы.

Т. Г. ШЭЎЧЭНКА
Партрэт работы мастака В. ВОЛКАВА.

І заканчвае Купала сваю паэму спасылкай, што аб горкім лёсе Бандароўны і аб тым часе засталіся толькі паданні ды песні ў народзе.

Паэма гэта характэрна з пункту гледжання зацікаўленасці Янкі Купалы да Украіны. Несумненна, зацікаўленасць гэта выклікана паэзіяй Тараса Шэўчэнка. Па-другое, яна характэрна і ў тых адносінах, што сюжэт яе быў запазычан, як было азначана, з фальклорных беларускіх запісаў. Несумненна таксама, што паданне аб Бандароўне перайшло да нас з Украіны.

На тым-жа украінскім матэрыяле напісаў Купала і верш «Я казак — не казак, што нагайкай свісціць, а казак, што калісь знаў, як волю любіць». Гэты верш з'яўляецца водгукам тых шэўчэнкаўскіх вершаў, у якіх апяваецца былая слава запарожскага свабодалюбівага казацтва. Цэлы рад другіх твораў Янкі Купалы паявіўся таксама ў выніку ўплыву Шэўчэнка. Верш Купалы «Перад вясельнай» пераклікаецца з паэмай Шэўчэнка «Сон». Даволі прачытаць любую страфу купалаўскага верша, каб пераканацца ў гэтым.

Прыблуды з-пад Невы крывавай!
Калі адпомсціцесь, калі?
За што стапталі маю славу?
За што на вясельню ўзвялі?

Увесь верш накіраван супроць цароў, дэспатаў і прыгнятальнікаў народа, бо яны «закавалі ў ланцугі і суд, і праўду, і закон», а «расправу назвалі правам». Да гэтай-жа групы вершаў адносіцца і аднайменны купалаўскі верш. У ім ёсць такія радкі:

Я сніў. А ўсё як-бы на яве
Кругом мяне жыло жыццём:
Той абмываў, той нож крывавіў,
Той спаў летаргу звадным сном.
Спіхала ў долы праўду звада,
За быт, за шчасце йшла вайна,
Парад цягнуўся за парадам,
Жыла, ўмірала старана.
(Я. Купала, т. І, стар. 150).

Шэўчэнкаўскія матывы з той-жа паэмы «Сон» чуюцца і ў вершы Купалы «І як тут не смяяцца».

На нашым хітрым свеце
Усяк жыве народ:
Адзін жыве па-людску,
Другі жыве, як скот.
Адзін другім гандлююць,
Купляюць, як той квас, —
Падноскі падбіваюць
Стаячаму не раз.
(Я. Купала, т. І, стар. 150).

Абодва гэтыя вершы нагадваюць пачатак паэмы Шэўчэнка «Сон».

У всякого своя доля
І свій шлях широкий:
Той мурує, той руйнує,
Той неситим оком
За край св'та зазирає,
Чи нема країны,
Щоб заграбаць і з собо
Взять у домовину;
Той тузами обірає
Свата в його хати,
О той нишком у куточку
Гострить ниж на брата.

Цэлая серыя іншых твораў беларускага паэта блізкая і родная творам вялікага украінскага паэта. У паэмах Шэўчэнка «Неофіты», «Марыя» і ў іншых сустракаюцца радкі, поўныя іроніі і сарказму, накіраваныя супроць бога, які з патураннем пазірае на ўсякія злачынствы, што чыняцца над народам. Так'я-ж творы ёсць і ў Янкі Купалы, напрыклад, «Цару неба і зямлі». Ёсць яны і ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля». Родная Украіна, яе цяперашняе і гістарычнае мінулае, палкае замілаванне да яе, да свайго народа, сум і журба ў разлуцы з імі — з незвычайнай мастацкай сілай і эмацыянальнасцю адлюстраваны ў шмат якіх творах Тараса Шэўчэнка. Гэтыя-ж пачуцці ў дачыненні да сваёй краіны выказаны і ў многіх вершах Янкі Купалы: «Я ад вас далёка, бацькоўскія гоні», «Мая малітва», «Крыўда» і інш. Злосна і бязлітасна бічуе Шэўчэнка дэспатаў-цароў і дармаеднае, тупое духавенства. Гэтыя матывы ў вялікай ступені ўласцівы і паэзіі Янкі Купалы. У Шэўчэнка мы знаходзім вершы, у якіх гучаць боль і горыч па адрасу сыноў сваёй краіны, якія забываюць пра яе. Усе гэтыя матывы гучаць і ў шмат якіх вершах Купалы і Коласа. Аб уплыве Шэўчэнка на беларускую паэзію і, у прыватнасці, на паэзію Янкі Купалы і Якуба Коласа гаворыць і сама паэтычная форма іх твораў. Прыёмы паэтычнага паралелізму, уласцівага народнай творчасці, вельмі часта прадстаўлены ў паэзіі Шэўчэнка. Гэтыя-ж прыёмы вельмі часта сустракаюцца і ў беларускай паэзіі. Напрыклад, у Шэўчэнка ў паэме «Тополя»:

«Защебече соловейко
В лузі на калині, —
Заспіває казаченько,
Ходя по долині.

У Купалы ў вершы «Над ракою ў спакою»:

Над ракою ў спакою
Зацвітала каліна,—
У сяле за ракою
Вырастала дзяўчына.

У Шэўчэнка:
Не щебече соловейко
В лузі над водою,
Не співає чорнобрива,
Стоя під вербою.

У Купалы:
Перастала каліна
У цвяточкі ўбірацца —
Перастала дзяўчына
З ненаглядным стрэчацца.

Такіх паралелізмаў, якія збліжаюць паэзію Шэўчэнка з паэзіяй Купалы, можна знайсці шмат. Своеасаблівы рытм шэўчэнкаўскай паэзіі, характэрны для яе сямістопны харэй з цэзурай пасля чацвертай стапы, замена харэя ямбам альбо амфібрахіем, багатая інструментоўка верша, мноства ўнутраных рыфмаў, — усё гэта характэрна і для паэзіі Янкі Купалы.

Агульныя матывы і трактоўка сірочай долі таксама збліжаюць паэзію Шэўчэнка з паэзіяй Купалы. Паэтычныя вобразы — русалкі, ведзьмы, прывіды, совы, элементы пейзажных зарысовак — курганы-магілы, крыжы, тапалі, прыбярэжныя лозы, чарот, Днепр,— усе гэтыя элементы ўласцівы беларускай паэзіі і, бясспрэчна, у значнай меры навеяны паэзіяй Шэўчэнка.

Гэтым кароткім аглядам далёка не поўна вычэрпваюцца агульныя рысы, якія збліжаюць паэзію Шэўчэнка з маладой беларускай паэзіяй. Беларуская паэзія расла і развівалася на аснове тых паэтычных мэтаімкненняў, якія так ярка выражаны ў творчасці вялікага украінскага народнага песняра-дэмакрата і рэвалюцыянера, таксама як і на паэзіі вялікіх рускіх майстроў мастацкага слова, чыя творчасць сваімі каранямі глыбока ўрастала ў шырокія пласты працоўнага народа.

Глыбокія сляды ўплыву Шэўчэнка носіць на сабе паэзія Паўлюка Труса. Гэта — паэт паслякастрычніцкага часу, малады і вельмі таленавіты. Але талент яго не паспеў расцвісці: Паўлюк Трус памёр дваццаціпяцігадовым юнаком. У скромнай маемасці, што засталася пасля смерці юнака-паэта, захаваўся экземпляр «Кабзара». Гэта — больш чым настольная кніга Паўлюка Труса. Ён ніколі не расставаўся з ёю і насіў яе з сабою. Шматлікія паметкі ў тэксце кнігі сведчаць аб той увазе і замілаванні, з якімі ставіўся Трус да паэзіі вялікага паэта. Аб гэтым-жа сведчыць і той факт, што Трус амаль напамяць ведаў усяго «Кабзара». Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя, зняўшы аковы царскай цэнзуры, шырока і гасцінна расчыніла дзверы магутнай паэзіі украінскага песняра і зрабіла яе здабыткам усіх працоўных Совецкага Саюза. На паэзіі «Кабзара» рос і развіваўся паэтычны дар Паўлюка Труса. Прастаце, народнасці, музыцы верша і ўсяму таму зачараванню, што так падкупляе ў паэзіі Шэўчэнка чытача, вучыўся ён у вялікага украінскага кабзара. Канву шмат якіх шэўчэнкаўскіх паэм кладзе ён у аснову сваіх твораў. Ён шырока і па-майстэрску выкарыстоўвае прыём Тараса Шэўчэнка — уплятаць у ткань твора народныя песні, умела падбіраючы іх і захоўваючы поўную гармонію паміж імі і творам. Апрача лірычных вершаў, напісаных з пачуццём сапраўднага паэта, вялікіх і ў поўнай меры закончаных паэм з акрэсленай паэтычнай мэтаімкнёнасцю ў Паўлюка Труса амаль няма. Гэта — эскізы, паэтычныя зарысоўкі, якія сведчаць аб паэтычным дараванні Паўлюка Труса. У іх столькі цеплыні, шчырага паэтычнага пачуцця і столькі шэўчэнкаўскага каларыту, што часамі цяжка адрозніць іх ад шэўчэнкаўскіх вершаў. Украіна, украінскія стэпы, курганы, хаты ў вішнёвых садах — вельмі часта паміналюцца ў вершах і няскончаных паэмах Труса. Напрыклад, у яго паэме «Развітанне»:

Ты ўспомніш стэпы Украіны
І спевы звонкія дзяўчат.
Настане ноч. Па-над лалінай
У тумане дрэмлюць ветракі;
Заводзяць песню парубкі,
І ў вішнях журацца хаціны,
Маўчаць таполі у далавах,
А песня коціцца далёка,
«Реве та стогне Дніпр широкий,
Сердитый вітер завива».

Тон і рытмічны рысунак паэзіі Шэўчэнка з усёю яе своеасаблівасцю, выкарыстанне характэрнага для Шэўчэнка сямістопнага харэя з цэзурай пасля чацвертай стапы, паэтычныя прыёмы паралелізму, — усё гэта шырока запазычана маладым беларускім паэтам у Тараса Шэўчэнка. Вось, напрыклад, урывак з лепшай паэмы Паўлюка Труса «Дзесяты падмурак»:

Разышліся пад гарою
Тры дарогі ў полі.
Па якой-жа тая доля?
Па якой нядоля?
А ці ліха — гора
Мяне стрэне на чужыне,
Стрэне й пагаворыць?
Не каліна над вадою
Пахіліла голле,
Плача маці сярод поля,
Праклінае долю.

Ад Шэўчэнка запазычвае Трус прыём пачынаць новы радок верша словам, якім канчаецца папярэдні радок. Напрыклад, у Шэўчэнка ў вершы «На вечную памяць Катлярэўскаму»:

Сонце гріє, вітер віє
З поля на долину,
Над водою гне з вербою
Червону **калину;**
На калине одиноке
Гніздечко гойдае...

У Труса:
Пахіліла над вадою
Тонкі стан **каліна,**
Пад калінаю дзяўчына...
(Цячэ рэчка з-пад явару).

У прыведзеных прыкладах звяртае на сябе ўвагу не толькі тэкстуальная блізасць Труса да Шэўчэнка, але і запазычанне шэўчэнкаўскіх вобразаў. У гэтым запазычанні Трус ідзе далей. Часамі ён цалкам бярэ шэўчэнкаўскія радкі і нават цэлыя строфы, некалькі вар'іруючы іх. Напрыклад, у Шэўчэнка:

Сонце гріє, вітер віє
З поля на долину...

У Труса:
Веюць ветры, ветравінне
З поля на даліну.

У Шэўчэнка:
Вітер в гаі нагинає
Лозу і тополю...»
(Мар'яна Черниця»).

У Труса:
Вецер ў гаю нагінае
Тонкую каліну...

У Шэўчэнка:
Вітер з гаем розмавляє,
Шепче з осокою,
Пливе човен по Дунаю
Один за водою.
Пливе човен воды повен...

У Труса:
Плыве човен вады повен,
Човен апаўночы.
Зацвілі, закрасавалі
Твае кары вочы.

Такіх прыкладаў шмат можна знайсці ў паэзіі Труса. Такім чынам, уплыў Шэўчэнка на творчасць маладога беларускага паэта дужа вялікі.

Вельмі любіў і высока расцэньваў паэзію Шэўчэнка другі беларускі паэт, Максім Багдановіч, выдатны майстар паэтычнага слова і ўдумлівы крытык. Таксама, як і Паўлюк Трус, Багдановіч памёр у маладым веку. Роўна дваццаць пяць гадоў таму назад ён напісаў два артыкулы, прысвечаныя геніяльнаму аўтару «Кабзара». Адзін артыкул называецца «Краса і сіла» — вопыт даследвання верша Т. Шэўчэнка. Абодва артыкулы напісаны па-руску. Свой першы артыкул Багдановіч пачынае словамі:

«Есць зоры, якія так блізкі адна да другой і так роўна злучаюць сваё святло, што здаюцца нам адным непарыўным цэлым. «Падвойнымі зорамі» называюцца гэтыя свяцілы. Іх лёс стаў лёсам музы Шэўчэнка і украінскай народнай паэзіі: падвойнай зоркай свецяць яны ў свеце мастацтва і харазтва».

Багдановіч прыводзіць выказванне праф. Кастамарава аб Шэўчэнка, што «Шэўчэнка, як паэт, гэта быў сам народ, прадоўжваўшы сваю паэтычную творчасць», што «песня Шэўчэнка была сама па сабе народная песня, толькі новая, такая песня, якую-б цяпер мог заспяваць цэлы народ». Гэту меткую фразу, зробленую, як кажа Багдановіч, на-вока, трэба выверыць шляхам аналізу творчасці Шэўчэнка. І ён ставіць перад сабою задачу — даць аналіз верша украінскага генія і высветліць сродкі паэтычнага ўплыву, які мае ў сабе гэты верш. Зрабіўшы падрабязны аналіз рытмікі паэзіі Шэўчэнка, адзначыўшы яе спецыфічныя асаблівасці, Багдановіч прыходзіць да вываду, што «ў асобе Шэўчэнка сусветная літаратура мае паэта з вершам меладычным і зграбным, паэта, які харазтво сваіх твораў будаваў не на сродках паэтычнага ўплыву, што б'юць у вочы, а, наадварот, — на сродках найбольш тонкіх: асанансах, алітэрацыях, унутраных рыфмах; паэт, які да гэтага харазтва адзначаных элементаў верша далучыў яшчэ незвычайную сілу сваіх рытмаў, а таксама арыгінальнасць, жывасць і грацыёзнасць рознастайных метраў». Па ліку ўнутраных рыфм Багдановіч не знаходзіць у рускай літаратуры паэта, роўнага Шэўчэнка. «Якраз тут, — гаворыць Багдановіч, — у гэтай галіне верша і высвятляецца, быць можа, найбольш дасканала ўсё тонкае харазтво паэзіі Шэўчэнка: звонку простая, скромная, яна поўна ўнутраным, прыхаваным, не кожнаму зроку даступным прыгоствам».

Так ацэньваў Багдановіч паэзію геніяльнага кабзара. У другім сваім артыкуле, прысвечаным стагоддзю з дня нараджэння Шэўчэнка, Максім Багдановіч гаворыць аб агульналюдскім значэнні твораў вялікага украінскага паэта. «Пэўна, — піша Багдановіч, — тыя глыбока-нацыянальныя формы, у якіх заключан гэты агульналюдскі змест, шмат болей скажуць сэрцу украінца, чым чалавеку іншай народнасці. Але і гэтаму апошняму Шэўчэнка не будзе чужым і незразумелым, і ў яго душы творы украінскага паэта знойдуць сабе водгук, бо пад іх своеасаблівую чаканкаю хаваецца поўнацэнны метал духоўнай культуры, агульнай усім цывілізаваным народам».

Максім Багдановіч займаўся таксама перакладамі вершаў Шэўчэнка на рускую мову. Ён пераклаў вершы «Кастамараву», «У няволі», «У няволі цяжка», «І неба няўмыта», «Гатова, парус распусцілі». Пераклады зроблены з той увагаю, з якою наогул ставіўся Багдановіч да твораў Шэўчэнка.

Вось, у агульных рысах, агляд асноўных момантаў уплыву Шэўчэнка на маладую беларускую паэзію. Як мы бачым, уплыў гэты вельмі значны, і Шэўчэнка належыць пачэснае месца ў фарміраванні нашай паэзіі. Гэты агляд — першая спроба даследваць ролю Шэўчэнка ў развіцці беларускай паэзіі. Агляд далёка не поўны і праілюстрыраван, галоўным чынам, паэзіяй Янкі Купалы, Якуба Коласа і Паўлюка Труса, і то далёка не ў поўнай меры.

125-годдзе з дня нараджэння Т. Г. Шэўчэнка выклікала вялікую зацікаўленасць з боку беларускіх паэтаў да літаратурнай спадчыны песняра украінскага народа. Горача адгукнуліся яны на гэту слаўную дату. Яны паставілі перад сабою задачу — даць поўны і поўнацэнны пераклад «Кабзара» на беларускую мову. Беларускі народ, які спяваў і спявае песні Шэўчэнка, часта не ведаючы іх аўтара, мае права патрабаваць ад сваіх паэтаў даць яму любімую ім паэзію песняра вялікага суседняга народа на беларускай мове, даць яе ва ўсім яе чаруючым харазтве, глыбіні і сіле, ва ўсім своеасаблівым яе бляску. Работа над перакладамі «Кабзара» яшчэ больш зблізіла нашых паэтаў з творчасцю Шэўчэнка. Уся магутнасць і глыбіня яго паэзіі, дзівоснае багацце фарбаў і гукаў адкрыліся нам у гэтай рабоце ў працэсе пераадольвання тых, часамі, вялікіх цяжкасцей, з якімі звязана перадача вершаў Шэўчэнка на беларускую мову, не гледзячы на блізасць украінскай і беларускай мовы. Мы імкнуліся даць пераклад блізкі да арыгіналу, захаваўшы ўсе асаблівасці паэтычных прыёмаў, паэтычную прастату і яснасць, музыку і напеўнасць шэўчэнкаўскай паэзіі. Мы ўважна і многа працавалі, пераадольваючы ўсе цяжкасці перакладу, маючы на ўвазе даць сапраўднага Шэўчэнка на беларускай мове. Гэтыя цяжкасці ў асноўным, як мне здаецца, пераадолены.

Тарас Грыгоравіч Шэўчэнка, чыя муза была цалкам аддадзена народу, непахісны змагар за народную справу, паэт, які меў поўнае права сказаць, звяртаючыся да сваёй суровай долі:

Не хітравалі мы з табою,
Мы проста йшлі. У нас няма
Няпраўды зерня за сабою, —

у нашы дні вырысоўваецца на ўвесь свой гіганцкі паэтычны рост перад шматнацыянальным, шматмільённым совецкім чытачом. Ён па дастоінству і па-праву займае месца побач з Пушкіным, Міцкевічам і Гётэ, з Сулейманам Стальскім, з Някрасавым і Шота Руставелі. Свабодны совецкі народ, як ніякі іншы ў свеце, цэніць шчырых і вялікіх сыноў чалавецтва, вялікіх мастакоў слова ўсіх вякоў і народаў, бо совецкі народ — дастойны наследнік агульналюдской культуры.

Па-большэвіцку рыхтавацца да дэкады

Соцыялістычная рэвалюцыя адрадзіла мастацтва шматнацыянальных народаў вялікага Савецкага Саюза і ўзбагаціла яго новым, соцыялістычным зместам. Новае мастацтва — народнае, яно адлюстроўвае велізарныя справы і думы народа, яго прадстаўнікі — таленавітыя выхадцы з народных мас, з мас рабочых, сялян і інтэлігенцыі. Таму народ любіць наша мастацтва, ганарыцца яго поспехамі. Традыцыйныя дэкады мастацтва нацыянальных рэспублік у Маскве — яркае сведчанне вялікіх дасягненняў вызваленага народа, факт грандыёзнага росту культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу.

Работнікі беларускага савецкага мастацтва, натхнёныя штодзённымі клопатамі і ўвагай партыі, урада і асабіста таварыша Сталіна да іх пачэснай працы, ствараюць на карысць народа цудоўныя творы. Падрыхтоўка да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве павінна мабілізаваць работнікаў мастацкага і літаратурнага фронта на далейшыя творчыя поспехі. Дэкада прадэманстрыруе велізарны росквіт соцыялістычнай культуры беларускага народа, разам з тым яна дасць каласальную зарадку для далейшай творчай работы.

Поспех дэкады залежыць ад агульнага ўздыму беларускага савецкага мастацтва, ад узняцця яго на вышэйшую ступень, таму справа дэкады з'яўляецца агульнанароднай справай. І этым важнейшым дзяржаўным мерапрыемствам павінны быць кроўна зацікаўлены партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі, штодзённа дапамагаючы работнікам мастацтва ў іх падрыхтоўчай рабоце, ствараючы ім належныя ўмовы для плённай творчай работы.

Ужо зараз, акторы, рэжысёры, драматургі, паэты, кампазітары, музыканты, мастакі плённа працуюць над новымі творамі.

Адказная работа ўскладаецца на драматургаў і паэтаў. Не гледзячы на тое, што ў галіне драматургіі і паэзіі за апошні год назіраецца значны рост, усё-ж наперадзе перад драматургамі і паэтамі стаяць яшчэ больш адказныя задачы. Драматургі павінны стварыць п'есы аб заснавальніках беларускай дзяржаўнасці, аб любімых правадырах народаў Владзіміру Ільічу Леніне і Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіне. Цікавыя тэмы чакаюць драматургаў. На тэрыторыі нашай рэспублікі некаторы час працавалі і кіравалі партыйнымі арганізацыямі баявыя саратнікі Леніна і Сталіна тт. Кагановіч, Фрунзе, Дзяржынскі, Орджанікідзе, Калінін, Ежоў, Мяснікоў. Гонарам кожнага пісьменніка з'яўляецца стварэнне п'ес пра слаўных рэвалюцыянераў.

Мала аддаюць увагі драматургі тэме соцыялістычнай працы стаханаўцаў фабрык, заводаў, соўгасаў, калгасаў. Вобразы рабочых, калгаснікаў і савецкіх інтэлігентаў павінны быць паказаны ў п'есах. Неабходна стварыць таксама драматургічныя творы для драматычных гурткоў.

Першачарговай задачай паэтаў з'яўляецца напісанне тэкстаў для песень і стварэнне оперных лібрэта.

Драмсекцыя ССП БССР павінна наладзіць творчую работу. Неабходна аслабаніць драматургаў ад іншай работы і даць ім магчымасць пісаць п'есы. Трэба дабіцца перад належнымі арганізацыямі, каб пісьменнікам дазволілі карыстацца гісторыка-рэвалюцыйнымі дакументамі, якія спатрэбяцца ім для новых твораў.

І, нарэшце, самае галоўнае — драмсекцыя разам з Упраўленнем па справах мастацтваў павінна прыцягнуць больш шырокае кола аўтароў да напісання п'ес. Няхай спаборнічаюць старэйшыя пісьменнікі з моладдзю. Дзеля гэтага не дрэнна было-б арганізаваць конкурс на напісанне п'ес. Гэта з'явілася-б вялікім стымулам у творчай рабоце і дапамагло-б выявіць новых драматургаў, дагэтуль невядомых нам. Стварэнне новага рэпертуару для тэатраў БССР павінна хваляваць беларускіх драматургаў гэтак-жа, як работнікаў тэатраў, асабліва зараз, калі мы рыхтуемся да дэкады.

Значную падрыхтоўчую работу да дэкады праводзіць Беларускі Дзяржаўны тэатр оперы і балета. У хуткім часе мы ўбачым першую беларускую савецкую оперу «Міхась Падгорны» Е. Цікоцкага (лібрэта паэта-ордэнаносца П. Броўкі). У сакавіку балетны калектыў пачне работу над балетам «Салавей» М. Крошнера (лібрэта М. Слонімскага паводле аповесці Зм. Бядулі). Неўзабаве пачнецца работа над операй «Дрыгва» дэпутата Вярхоўнага Совета БССР А. Багатырова (лібрэта Е. Рамановіча паводле аповесці Я. Коласа).

Дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР А. Туранковым напісана опера «Кветка шчасця», лібрэта якой яшчэ пішуць паэты-ордэнаносцы П. Броўка і П. Глебка. Кампазітар А. Туранкоў зараз працуе над новай операй «Пагранічнікі» (лібрэта І. Шапавалава). Першы акт ужо напісан.

Рэпертуар па сваёй тэматыцы надзвычай цікавы. У гэтых творах адлюстроўваецца мінулае і сучаснае жыццё беларускага народа. Цяпер неабходна фарсіраваць выпуск прэм'ер, каб беларуская грамадскасць магла загадзя пазнаёміцца з арыгінальнымі операмі. А гэта абавязвае кампазітараў паскорыць работу па напісанню новых работ. Праверыўшы свае творы на гледачу, можна будзе выправіць памылкі.

Каб ажыццявіць гэты рэпертуар, кіраўніцтва Опернага тэатра павінна павялічыць аркестр і хор за лік студэнтаў Кансерваторыі, сіл Філармоніі і запрошаных аркестрантаў і харыстаў братніх рэспублік. Гэта неабходна зрабіць зараз, каб у далейшым нястача артыстаў не адбівалася на якасці работы.

І, нарэшце, асноўнае, у чым павінен дапамагчы Соўнарком БССР і Упраўленне па справах мастацтваў, — гэта хутчэйшае заканчэнне будаўніцтва тэатра. Кансервацыя трупы значна тармозіць творчы рост калектыва.

Драматычныя тэатры павінны разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва за лепшую падрыхтоўку да дэкады. У першую чаргу тэатры павінны ажыццявіць пастаноўку новых п'ес пісьменнікаў Савецкай Беларусі. Таксама неабходна перагледзець старыя спектаклі, як класічныя, так і савецкіх аўтараў; лепшыя з іх безумоўна можна будзе паказаць на дэкадзе ў Маскве. Каб паскорыць выпуск новых пастановак, неабходна спектаклі рыхтаваць паралельна.

Вялікія надзеі ў падрыхтоўцы да дэкады ўскладаюцца на Дзяржаўную філармонію БССР. Філармонія павінна паказаць лепшыя творы кампазітараў і лепшыя сілы выканаўцаў Савецкай Беларусі. Да гэтага часу, трэба прама сказаць, наша Філармонія мала выконвала твораў беларускіх кампазітараў. За ўвесь час не было выканана цалкам ні адной сімфоніі. Мала было творчых канцэртаў кампазітараў БССР. Мы спадзяемся, што падрыхтоўка да дэкады знішчыць незаслужаную абыякавасць з боку некаторых кіраўнікоў Філармоніі да творчасці кампазітараў нашай рэспублікі.

Канцэрты Філармоніі на дэкадзе будуць аб'яднаны двума тэмамі — «БССР — фарпост на заходняй граніцы Савецкага Саюза» і «Калі заўтра вайна». У залежнасці ад гэтых тэм, усе нумары канцэртаў — песні, танцы, музычныя творы для аркестраў (сімфанічнага і народных інструментаў) будуць напісаны беларускімі кампазітарамі. У гэтай рабоце прымуць удзел усе кампазітары БССР.

Акадэмія навук БССР зараз адбірае лепшыя творы (песні, танцы) савецкага фальклору, якія будуць выкарыстаны ў канцэрце. У раёны БССР будуць пасланы брыгады кампазітараў і навуковых работнікаў Акадэміі для запісу сучаснай музычнай народнай творчасці; кампазітары апрацуюць яе.

Беларускія паэты і кампазітары напішуць некалькі песень — песню пра Сталіна, прывітанне Маскве, фінальную абаронную песню, а таксама чырвонаармейскую песню і пляску, піянерскую песню і пляску і г. д.

У заключным канцэрце дэкады прымуць удзел калектывы Філармоніі, салісты Тэатра оперы і балета, група таленавітых дзяцей, балетная школа, лепшыя ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці горада, вёскі, Чырвонай Арміі. Зараз у прафесіянальных калектывах ідзе адбор рэпертуару, які будзе паказан у Маскве. Адбіраецца і нанава пішацца музычная літаратура для моладзі музычных навучальных устаноў, якія таксама прымуць удзел у канцэртах дэкады.

План вялікі і цяжкі. Для таго, каб яго выканаць, Філармоніі трэба будзе сур'ёзна перагледзець свае калектывы. Неабходна будзе ўкамплектаваць кваліфіцыраванымі музыкантамі і спевакамі сімфанічны аркестр, хор, аркестр народных інструментаў і рэарганізаваць ансамбль беларускай народнай песні і пляскі, умацаваўшы яго прафесіянальнымі спевакамі і танцорамі.

Трэба зараз-жа павесці барацьбу за якасць мастацкіх твораў, якія прызначаюцца для выканання на дэкадзе. Спектаклі і канцэрты павінны быць добра аформлены, добра пастаўлены і добра выкананы. Для гэтага неабходна будзе прыцягнуць лепшыя сілы мастакоў, рэжысёраў, актораў, спевакоў, музыкантаў, кампазітараў сваёй рэспублікі, а таксама братніх рэспублік.

Надзвычай крапатлівую работу прыдзецца правесці Дому народнай творчасці БССР па адбору лепшых калектываў і асобных таленавітых удзельнікаў мастацкай самадзейнасці для выступлення на дэкадзе. Да конкурса, які адбудзецца ў маі, Дом народнай творчасці і мясцовыя кіруючыя арганізацыі павінны дабіцца таго, каб да выдатных калектываў самадзейнасці былі прымацаваны акторы, рэжысёры, кампазітары для вядзення там сістэматычнай творчай работы.

Упраўленне па справах мастацтваў павінна яшчэ шчыльней звязацца з творчымі арганізацыямі пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, з тэатрамі, Філармоніяй, Домам народнай творчасці і, узаемна дапамагаючы адзін другому, па-большэвіцку разгарнуць падрыхтоўку да дэкады беларускага мастацтва. Новыя творы пісьменнікаў, кампазітараў — спектаклі, мастацкае афармленне, п'есы і нават праграму канцэрта трэба абмеркаваць сярод актыва работнікаў мастацтва.

Усе работнікі мастацтваў на ўзорах падрыхтоўчай работы да дэкады павінны вучыцца працаваць па-новаму.

Работа пачата. Беларускіх работнікаў мастацтваў чакае ўперадзе шмат раданай працы. Мы павінны аддаць увесь свой талент, усе свае сілы для таго, каб геній чалавецтва нашага часу таварыш Сталін, убачыўшы нашу творчасць, сказаў: — Добра.

НАСУСТРАЧ XVIII З'ЕЗДУ ВКП(б)

ДЗВЕ ПРЭМ'ЕРЫ

З велізарным творчым уздымам працуе Віцебскі Белдзярждрамтэатр над пастаноўкамі п'ес «Пагібель воўка» і «Генконсул». Паміж групамі актораў тэатра, якія працуюць над гэтымі спектаклямі, разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва імя XVIII з'езда партыі. Сярод асноўных умоў спаборніцтва — своечасовы выпуск спектакляў, добрае веданне ролей і дапамога вядучых актораў маладым.

У дзень адкрыцця XVIII з'езда партыі тэатр пакажа «Генконсула» байцам і камандзірам падшэфных ваенных часцей вобласці.

Спектакль «Пагібель воўка» будзе выпушчан у сярэдзіне красавіка. Ставіць п'есу «Пагібель воўка» засл. арт. рэсп. Малчанаў, рэжысёр-асістэнт Мазалеўская. У вядучых ролях заняты нар. арт. рэсп. Ільінскі, засл. арт. рэсп. Кашэльнікава, Сяргейчык, Малчанаў і інш.

«Генконсул» ставіць рэжысёр Іваноў, у ролі генконсула выступае засл. арт. рэсп. Звездачотаў.

Рад работнікаў тэатра вылучан на дапамогу мастацкай самадзейнасці рабочых клубаў.

У дні 21-й гадавіны Чырвонай Арміі тэатр выязджаў у падшэфныя часці з канцэртам. 19 лютага ўвесь калектыў тэатра выязджаў у Н-скі пагранатрад, дзе паказаў спектакль «Чалавек з ружжом». Спектакль быў спаткан байцамі і камандзірамі з вялікім захапленнем. На дапамогу самадзейнасці гэтага пагранатрада прымацаваны рэжысёры і артысты тэатра.

7 сакавіка ў Віцебску будзе арганізавана сустрэча актораў тэатра з калектывам мастацкай самадзейнасці буйнейшага прадпрыемства Віцебска — фабрыкі «КІМ».

З вялікім энтузіязмам разгортвае калектыў тэатра падрыхтоўку да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

—⊙—

Творчае спаборніцтва кампазітараў

Кампазітары БССР актыўна рыхтуюцца да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Для заключнага канцэрта дэкады кампазітары БССР у творчым спаборніцтве пішуць новыя песні. Гэта — песні аб Сталіне, аб Маскве, аб абароне нашай краіны, аб Чырвонай Арміі, піонерах і г. д. Рад кампазітараў апрацоўвае савецкі беларускі фальклор. Кампазітары тт. Цікоцкі, Пукст, Шчэглоў, Аладаў, Самохін пішуць новыя сімфанічныя творы, тт. Багатыроў і Крошнер — вакальна-аркестровыя творы, тав. Клумаў — фортэп'янны канцэрт, тав. Падкавыраў — санату для фортэп'яна, тт. Чуркін і Шнітман — квартэты.

Вялікая ўвага ўдзелена харавым творам (у гэтай галіне працуюць тт. Палонскі, Любан, Ефімаў, Равенскі), масавым песням, дзіцячай літаратуры, педагагічнаму рэпертуару, рэпертуару для бытавых аркестраў (тт. Іваноў, Лукас і інш.).

Над операмі працуюць кампазітары тт. Залатароў, Туранкоў, Шчэглоў, Падкавыраў, Аладаў. Пачынаюць работу па стварэнню опер тт. Чуркін і Самохін.

Музычныя камедыі пішуць тт. Палонскі і Іваноў.

25 год літаратурнай дзейнасці Н. Н. АСЕЕВА

Паэт рэвалюцыі

У адным з сваіх вершаў Нікалай Асееў піша:

«Вот иду,
и мускулы легки,
в сторону не отойду,
не сяду».

Выдатны майстар нашай савецкай паэзіі, друг і саратнік Владзіміра Маякоўскага, Нікалай Асееў у сваёй творчасці ніколі не зварачваў з шырокай дарогі рэвалюцыі, ніколі не ішоў наперакор эпосе.

«Страна моя!
где набрала ты
таких
не рассказанных
слов?»

У радасным захапленні цудоўнай сілай радзімы і яе гераічных людзей здзіўляецца паэт. І ён з пачуццём велізарнай адказнасці перад народам у кожным сваім творы, у кожным радку сваіх вершаў і паэм дорыць нам поўныя творчага агню і натхнення перлы нікім яшчэ так бліскуча і таленавіта «не рассказанных слов». Гэта — паэма аб 26 бакінскіх камісарах, паэма «Семен Проскаков» — аб мужным партызану, аддаўшым сваё жыццё за вызваленне роднай савецкай зямлі ад інтэрвентаў. Гэта — вядомыя ўсяму народу песні аб будзёнаўскай конніцы, аб лётчыках і спартсменах, аб пагранічніках, варашылаўскіх стралках.

Вялікі творчы шлях прайшоў Нікалай Асееў за дваццаць пяць год сваёй літаратурнай дзейнасці. Яшчэ ў першым, выйшаўшым у 1914 годзе, зборніку «Ночная флейта», у кнізе «Оксана» (1916 год) даволі моцна гучалі рэвалюцыйныя ноты, моцна выказваўся пратэст супроць душыцеляў свабоды народа. «Вкатилась вольности река, смывая гибель и измену» — піcаў Асееў аб рэвалюцыі 1905 года.

На ўсю сілу разгарнуўся мастацкі талент Нікалая Асеева пасля рэвалюцыі. Следам за Маякоўскім і разам з ім, з такім-жа творчым энтузіязмам бярэцца Асееў за распрацоўку новай тэматыкі. Яму ўдаецца адным з першых у савецкай літаратуры паказаць тое новае, што ўнесла рэвалюцыя ў свядомасць савецкіх людзей, тыя якасці, якія выхоўвае партыя ў самых шырокіх пластах народа. Паэт рэвалюцыі, паэт самых глыбокіх рэвалюцыйных пачуццяў, паэт са сваім уласным голасам і творчай манерай — такім мы ведаем і любім аўтара кнігі «Совет ветров», тварца паэмы аб 26 бакінскіх камісарах, стваральніка манументальнай паэмы аб мужным і скромным герою грамадзянскай вайны Сямёну Праскакаву.

Вялікая слухавая і рытмічнаяназіральнасць, упартая работа над словам і вобразам, нястомныя пошукі новых мастацкіх сродкаў, якія маглі-б найбольш поўна выразіць веліч нашага часу, — усё гэта робіць Асеева адным з самых блізкіх народу, адным з самых яркіх і самабытных паэтаў Савецкага Саюза. Чытач з вялікай увагай і цікавасцю сочыць за работай паэта над паэмай «Маяковский начинается», паэмай, у якой Асееў з вялікай любоўю малюе вобраз свайго друга і настаўніка — лепшага паэта савецкай эпохі Владзіміра Маякоўскага.

Нядаўна партыя і ўрад адзначылі творчыя поспехі Нікалая Асеева, узнагародзіўшы яго ордэнам Леніна. 25-гадовы юбілей сваёй творчай дзейнасці паэт сустрэў поўны творчых сіл і планаў, поўны жадання нястомна тварыць на славу нашай радзімы.

Вітаючы юбіляра, савецкі народ жадае яму новых поспехаў і ўдач на слаўным шляху паэта.

—○—

МАСКВА, САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ—АСЕЕВУ

Дарагі Нікалай Нікалаевіч!

Пісьменнікі БССР горача вітаюць Вас, буйнага і патрабавальнага майстра савецкай паэзіі, у дзень 25-годдзя Вашай літаратурнай дзейнасці. Актыўнае ўздзеянне Вашых вершаў, іх народная песеннасць і лірычнасць, высокая страсць служэння мастацтву ў яго новым, савецкім разуменні — вось тыя неад'емныя якасці Вашага буйнага таленту, якія заслужылі Вам вялікую вядомасць і папулярнасць сярод масавага чытача нашай краіны.

Жадаем Вам, дарагі тав. Асееў, доўгіх год плённай і паспяховай работы на карысць нашага народа і нашай шчаслівай соцыялістычнай радзімы.

Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Пятро Глебка, М. Лынькоў, Пятрусь Броўка, Аркадзь Куляшоў, М. Клімковіч, К. Крапіва, Я. Маўр, А. Кучар, З. Аксельрод, Г. Бярозкін, Г. Камянецкі, Э. Агняцвет, П. Панчанка, М. Груб'ян, І. Гурскі, Х. Шынклер, М. Ільінскі, К. Цітоў, А. Шарапаў, І. Шапавалаў, В. Глазырын.

Янка КУПАЛА

ТАРАСАВА ДОЛЯ

ПАМЯЦІ ТАРАСА ШЭЎЧЭНКА

1.

Ходзіць гоман па Украіне
У святочных шатах...
Гаманіць Дняпро са стэпам
Аб вялікім святу.

Тую долю, што калісьці
Тарас напрарочыў,
Тую долю чуюць вушы,
Бачаць ясны вочы.

Тая воля, на якую
Тарас спадзяваўся,
Загуляла ў буйным стэпе,
Сонцам абвілася.

Тое шчасце, аб якім так
Тарас вечна марыў,
У народзе на свабодзе
З Крэмля гаспадарыць.

Добрым словам памінае
Вялікага сына
Украіна маладая,
Вольная Украіна.

2.

Як раджала яго маці,—
Не свяцілі зоры,
Зубы скаліла няволя,
Хіхатала гора.

Песень радасных, вясёлых
Над яго калыскай
Не спявалі маладухі
Ні здалёк, ні зблізку.

А як вырас, як падняўся,
На свае стаў ногі,—
Следам—паншчына, батрацтва,
Панскія парогі.

Крукам гнуўся перад панам,
Уздыхаў нясмела,
Катавалі батогамі
Юнацкае цела.

Энгельгарды, Энгельгарды!
Ужо вам не паўстаці,—
Адамсціла Украіна
За дзяцей і маці.

3.

А было ў тыя часіны
Цёмна, бы ў магіле,
Людзі гінулі, як мухі,
Ці, як здань, блудзілі.

Ні святла таго, ні ўсмешкі,
Хоць-бы на хвіліну.
Ночка хутала Украіну,
Ці-ж толькі Украіну?!

І скрыпелі, і бразджэлі
Ланцугі наўкола;
Панства людам гандлявала,
Як нямой жывёлай.

Прадавала і мяняла,
У карты прайгравала;
Крыві, слёзам канца-меры
Бядняцтва не знала.

Гэткай катаргі і мукі
Пяром не апішаш.
Прамінула. Толькі думку
Успамін калыша.

4.

Нарадзіўся на свет белы
І Тарас у путах,
А не лёгка, ой, браточкі,
Змалку быць закутым!

Я таксама нарадзіўся
У ланцугах пад царам.
Спапяліў-бы ту часіну,
Каб я мог, пажарам!

Прайшлі годы. Тарас вырас.
Як таполя ў полі.
Выкуплялі добры людзі
Тараса з няволі.

Як браў грошы пан вяльможны
Рукою паганай,
Кроў блішчэла на дукатах,
Кроў людзей скаваных.

Кроў скаваных бацькі, маці,
Скованага сына
Кроў блішчэла на дукатах
Скутае Украіны.

5.

Па гасцінцы беларускім,
У Пецербург з Варшавы
За карэтаю за панскай
Пхнецца хлопец жвавы.

Гэта йдзе Тарас-нявольнік,
Служка ясне-пана,—
Пан у золаце, ён, бедны,
Босы, абарваны.

Беларускія бярозы
Абапал гасцінца
Калыхалі думкі шумам
Хлапчуку-украінцу.

Бор шумеў яму над вухам,
Булькалі крыніцы,—
Маладому, дасціпному
Было чым дзівіцца.

Бачыў убогія хаціны,
Крытыя саломай,
Людзей бачыў паднявольных,
Што і ў сябе дома.

6.

Чаму ў сэрцы беларускім
Песня Тарасова
Адгукнулася, запела
Зразумелым словам?

Чаму вецер з Украіны
З думкаю крылатай
Далятаў да Беларусі
І шумеў над хатай?

Бо йшла доля беларуса
З доляй украінца
Аднолькава ў поце, ў слёзах
Церневым гасцінцам.

Бо згіналі аднолькава
Змалку да сканання
Шыі ў ёрмах і чакалі
Яснага світання.

Як жылося, як вялося,
Як марнелі сілы,
Таму сведкай там і тутка
Курганы, магілы.

7.

Пакахаў Тарас дзяўчынку
У дзяцінстве, рана,
І да самае да смерці
Не забыў Аксаны.

Разам пасвілі чужыя
Свінні ды авечкі,
Разам бегалі ўдагонкі
Босыя да рэчкі.

Колькі выснілі абое,
Думак нагадалі,—
Гэта знае стэп шырокі,
Ды дняпровы хвалі!

Сэрца меў Тарас такое,
Што любіць умела,
Вочы меў, што ўмелі плакаць
Па мілай век цэлы.

Тараса пагнаў з сабой пан
З роднае краіны,
А Аксана шукаць хлеба
Пабрыла ў чужыну.

8.

Хто-б падумаў, здагадаўся,
Што ў такіх аковах
Быў Тарас багаты скарбам,
Скарбам адмысловым.

Ні цары, ні іхні слугі,
Ні паны, ні каты
Не маглі забраць, украсці
Гэты скарб багаты.

А была яго багаццем,
Скарбам небывалым
Была песня, што з-пад сэрца
На свет вылятала.

Не танула песня ў моры,
У агні не гарэла,
Закаваць не мог у путы
Сатрап азвярэлы.

Маляваў ён і малюнкі,
Ды як сіл ні траціў,
Не ўдалося ў няволі
Шчасце змаляваці.

9.

І не спіцца, і не сніцца
Тарасу на свеце,
Дзе ні гляне—скрозь няволя
Плача маці, дзеці.

Украіна пад панамі,
Пад жандарам-царам
Сіратою стогне, гіне
У жудкіх думах, марах.

Вешаць ляхаў, з плеч скідаці
Царскія галовы!—
Зашумела па Украіне
Песня Тарасова.

Усю крыўду, катаванне,
Што душыла грудзі,
Выліваў ён на паперы,
Каб ведалі людзі.

Заклікаў да лепшай долі,
Долі і свабоды,
Клікаў шчасце, клікаў сонца
Для свайго народа.

10.

Пайшло слова Тарасова
Горда, непакорна,—
Знайшла водклік яго песня
У людзей прыгонных.

Людзі вочы праціралі,
Выглядалі волі.
— Тарас праўду нам спявае,—
Спявай-жа, брат, болей!

А цара, яго прыдворню,
А паноў крывавых
Агарнуў страх ад такое
Бунтарскае з'явы.

Думу думалі, як лепей
Тараса караці,
Ці на полі, на кургане,
Ці ў бацьковай хаце.

І каралі яго карай,
Каб нямым зрабіўся,
Каб складаці свае песні
Навек адвучыўся.

11.

Ой, шлях катаржны не лёгкі,
Вытаптаны горам,
Касцьмі людскімі услань,
Вымыты слёз морам!

Павяла па ім, халодным,
Тарасова доля
Цераз пушчы, цераз нетры,
Праз пустое поле.

Адзінока. Гукнуць спробуй—
Не пачуеш рэха,
Толькі звер падчас завые
Ашалелым смехам.

Ой, загнаў цябе, Тарасе,
Подлы цар-душыцель!
У труну злажыў жывога,
Каб не думаў жыці.

Тарасовы гора, мукі
Камень толькі бача,
Ды шумлівы вецер чуе,
Як гаротны плача.

12.

Крэпасць Орская—астрогам
Ды з царскім указам—
За пяро каб і за пэнзель
Не браўся ні разу.

Каб не браўся і не думаў
Дум сваіх крамольных.
Во, якую панёс кару
Пясняр паднявольны!

А сны сняцца аб радзіме,
Аб стэпе мурожным,—
Маляваў-бы хоць крывёю,—
І крывёй не можна.

Думкі лезуць, выліваў-бы
Думкі на паперы,—
І нявінную паперу
Адабралі зверы.

Чахне, сохне, адарваны
Ад роднае нівы
Пад салдацкай царскай палкай
Тарас нешчаслівы.

13.

Такой кары акаяннай
Не жадай нікому!
Павяртаў Тарас з няволі
У няволю дадому.

З'ела царскае караннe
Тарасову сілу,—
Менш глядзеў ужо на неба,
Болей на магілу.

Адно песень, песень гулкіх
Не забыў складаці,
Не забыў у песнях-думках
Украіну-маці.

Мо' пісаў-бы свае думы
Ён крывёй і далей,
Але з жылаў яго каты
Кроў павыпівалі.

Ласа высмакталі гады
Яго кроў з-пад сэрца.
Хай-жа памяць гэтай крыўды
Навек застанецца!

14.

І памёр Тарас. Няволя
З горам даканалі.
Зашумелі сумна-сумна
Дняпровыя хвалі.

Паплылі Дняпровы хвалі
Ажно ў сіне мора.
Хай гавораць хвалі свету
Аб вялікім горы!

І заплакала Украіна,—
Плакала не мала,
Як хавала свайго сына,
Песняра хавала.

Насып сыпалі высокі
Па-над Дняпрам сінім,
Каб відаць было далёка—
Па ўсёй Украіне.

Спіць Тарас, адпачывае
У вёсны і прадвесні.
Не спіць толькі між людзямі,
Не спіць яго песня.

15.

Гэй, Тарас, каб ты збудзіўся,
Каб устаў з магілы,
Ды зірнуў ты на Украіну,
Песняру наш мілы!

Ой, пабачыў-бы ты дзівы,
На стэпу шырокім!
Новай песняй прывітаў-бы
Дняпро сінявокі.

На тваёй зямлі квяцістай
Сонца ясна свеціць,
Не згібаюць плеч у ёрмах
Бацька, маці, дзеці.

Ройным роем гаспадараць
Сабе самі людзі.
Будаўніцтва йдзе такое,
Нібы цуд на цудзе!

А ні слёз тых, а ні гора,
Ні цара, ні пана!
Эх, Кабзар, каб ты збудзіўся,
На Украіну глянуў!.

Менск, 27-II-39 г.

ТАЛЕНАВІТЫ ПАЭТ-ЛІРЫК

За апошні час у Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшла некалькі першых кніг маладых беларускіх пісьменнікаў. Зусім відавочна, што наш чытач з прагнасцю накінецца на гэтыя кнігі, каб пабачыць, што новага ўносяць маладыя пісьменнікі ў літаратуру, чаго чакаць яму, чытачу, ад маладой парослі беларускай літаратуры.

Чытач не ашукаецца ў сваіх чаканнях і надзеях — у беларускую літаратуру прышоў новы атрад таленавітых пісьменнікаў. Сярод іх адно з першых месц займае таленавіты паэт-лірык Пімен Панчанка, які выпусціў у свет першую кнігу сваіх вершаў «Упэўненасць». Чым больш чытаеш гэты зборнік, тым больш відавочна, што ён не толькі не гучыць пратэнцыёзна, а па сутнасці адлюстроўвае ўпэўнены прыход маладога пісьменніка ў літаратуру, яго веру ў свае сілы.

П. Панчанка — малады вясковы настаўнік, ён добра ведае настроі, думы і мары маладога калгасніка нашай вёскі, маладога савецкага інтэлігента.

Вершы П. Панчанкі напісаны простай, але высокапаэтычнай мовай. Народная метафарычнасць, трапныя і свежыя параўнанні («сядзяць снапы, як рыжыя браты», «ехаў май зялёны да нас з вясёлкавай дугой»), з густам падабраныя дэталі, прадзельна сціслая фраза, дзе за кожным словам стаіць чотка акрэслены вобраз, — усім гэтым багаты вершы Пімена Панчанкі і ўсё гэта робіць яго паэзію свежай і арыгінальнай. «Ні аднаго слова лішняга», «ні аднаго неапраўданага палажэння», — гэтага залатога правіла сапраўднай літаратуры прытрымліваецца Панчанка. Глыбокая думка і глыбокія пачуцці пранізваюць абсалютную большасць яго вершаў. Нашым маладым пісьменнікам ёсць чаму павучыцца ў Панчанкі.

Самыя лепшыя вершы ў зборніку прысвечаны таварышу Сталіну, у тым ліку і верш, які адкрывае зборнік. У гэтым—яшчэ раз сведчанне арганічнай сувязі паэзіі Панчанкі з рэчаіснасцю. І правільна малады паэт у вершы «Радзіме» задае пытанне-адказ:

Што мне можа быць больш за
радзіму любімую міла?
Хто-ж мне будзе радней за таго,
хто радзіму стварыў?

Малады паэт адбірае суровыя і простыя словы, каб перадаць сваю любоў к правадыру. Сталінская мудрасць і празорлівасць перададзена Панчанкам кароткай ударнай фразай: «Глядзіш, як прарок, у вякі» — і гэта фраза назаўсёды запомніцца чытачу. Любоў савецкага народа да таварыша Сталіна, адзінства народа і правадыра перададзены таксама красачна і глыбока. Маці, якая пяе над калыскай пра Сталіна дзецям сваім, і байцы, якія з імем Сталіна на вуснах ідуць у бой, каб не даць ворагу ні аднаго вяршка свяшчэннай савецкай зямлі, народ, які ўсёсакрушальным гневам сваім раздавіў трацкісцка-бухарынскіх агентаў фашызма, калі яны асмеліліся ўзняць сваю брудную здрадніцкую руку на тое, «што нам Сталіным дадзена», на партыю і правадыра народаў, — у такія вобразы ўвасабляе П. Панчанка любоў народа да свайго правадыра. Ён услаўляе Сталінскую Канстытуцыю, закон, аб якім народ ведае, што —

Прынёс яго мудры настаўнік
Народу, як сонечны дар.

У невялікім вершаваным апавяданні «Пра Васілька і правадыра» П. Панчанка надзвычай цёпла, па-народнаму проста паказвае ўзаемаадносіны таварыша Сталіна і народа, бацькоўскія адносіны таварыша Сталіна да кожнага чалавека. Змест гэтага апавядання такі: у глухой вёсцы, далёкай ад горада, цяжка захварэў адзіны сын сялянкі. Маці, страціўшая надзею выратаваць сына ад смерці, дае тэлеграму ў Крэмль з просьбай аб дапамозе. Не гледзячы на занятасць вялікімі справамі, таварыш Сталін безадкладна накіроўвае на самалёце доктара ў глухую беларускую вёску. Васілёк выратаван ад смерці.

Зноў загучэла прапелера песня —
Сталіну матчына дзякуй панесла.

Гэты верш — адзін з лепшых вершаў для дзяцей. Ён мае вялікае выхаваўчае значэнне і Наркамасветы правільна зрабіў-бы, калі-б уключыў яго ў праграму выкладання літаратуры ў школах.

Правільна адлюстроўваючы рэчаіснасць, П. Панчанка неаднаразова звяртаецца да думкі, што ўсе нашы поспехі звязаны з імем таварыша Сталіна, што дырэктывы, указанні, мыслі, імя і прыклад правадыра натхняюць савецкага чалавека на дружную, адданую работу на любым участку нашага будаўніцтва. У цёплым лірычным вершы «Вясковыя мары» Панчанка падае вобраз вясковага брыгадзіра, заклапочанага прыходам вясны. Брыгадзір марыць:

Змагацца будзем і урэдзяць
Дзівосныя жыты, аўсы,
Цяжкія будуць каласы
На працаднях нашых ляжаць.
Паводкай жыта на таку
З-пад малацілак будзе ліцца,
І мы, як першыя, руку
Пацiснем Сталіну ў сталіцы...

Бо «лепшай слыве ўзнагародай» ва ўсім неабдымным Савецкім Саюзе «сталінскі поціск рукі».

Значная колькасць вершаў прысвечана радзіме, хаця толькі адзін з іх назван гэтым імем. Але па сіле любві і захаплення роднай краінай, па зніта-ванасці пейзажных замалёвак і творчай работы чалавека, паказанага на фоне гэтых пейзажаў, па аб'яднанню матываў асабістай і палітычнай лірыкі — можна аднесці да гэтай тэмы вельмі многа так-званых пейзажных вершаў Панчанкі і інтымнай лірыкі.

О радзіма, табою напоўнена сэрца да
краю
І заўжды: ці працую, ці пільна на
варце стаю,
Я твой велічны вобраз у думках сваіх уяўляю
І люблю, як жыццё, я зямлю маладую тваю.

Гэта любоў да маладой савецкай зямлі і к таму, хто ператварыў яе ў квітнеючы сад, у сапраўдную радзіму чалавека — сапраўды спадарожнічае ўсім пачуццям паэта. Вось паэт абрушвае гнеў народа на галовы фашысцкіх псоў, якія спрабавалі прадаць радзіму замежным інтэрвентам, і праходзіць па роднаму краю, даючы рад яркіх зарысовак пейзажаў і людзей:

Я іду... Рассцілаюць дзяўчаты ільны,
Нібы гаці пракладваюць простыя,
Яны спорна працуюць—адбітак вясны
У юнацкіх прыкмецїў я постацях.
Спавіваюць дзяўчаты блакітны прастор
Лёгкай песняй—дзявочымі марамі.
...Я па лесе іду... Рыжых сосен сям'я
Над маёй галавой крыллі звесіла.
... Я па садзе іду—шмат пладоў залатых
Цешаць вока сузор'ямі зябнымі.
Наліліся антонаўкі сокам густым,
Абцяжарылі нізкія яблыні.

Харaство прыроды і адчуванне заможнасці чалавека, уладарніка гэтай прыроды, прыводзіць паэта да палітычнага вываду:

Добра жыць і тварыць пад радзімай
зарой.
Выйду раніцай я, выйду вечарам —
Славіць Сталіна наш працавіты народ
За клапоты, за лёс чалавечы.

Вось другі верш — «Упэўненасць». Ён пачынаецца прыгожай пейзажнай замалёўкай:

Адгрукаў гром, адгаманіла лета
На мове зор малінавых і кветак.
Там, дзе гулі пшаніцы і жыты,
Сядзяць снапы, як рыжыя браты.
Б'е жарабок падковай. Поўны воз
Гатоў адплыць да вёскі. Рып калёс
І хлебны пах зямлі, і гэты вечар —
Гаворыць мне аб шчасці чалавечым.

Такія прыклады можна-б было выпісаць амаль з кожнага верша П. Панчанкі. Любоў да радзімы, да новага шчаслівага жыцця адухаўляе пейзажныя зарысоўкі. Панчанка рукой упэўненага майстра дае карціны прыроды і працы, знаходзячы безліч новых, свежых фарбаў.

Абароне краіны і барацьбе з фашызмам таксама прысвечан рад вершаў, сярод якіх самыя лепшыя—«Кіраву», «Пагранічча», «Заўтра», «Загінуўшаму сябру». У вершы «Кіраву», дзючы незабыўны вобраз агністага трыбуна рэвалюцыі, Панчанка выказвае народную думку аб тым, што нават смерць не разлучыла Кірава з народам, бо:

У нашых сэрцах не пагас
Прамоў тваіх гарачы водгук.
... З'яднаў нас, Кіраў, вобраз твой
І ў развітання дзень апошні
Мы прысягнулі над трунoй
Фашысцкіх наймітаў знішчыць.

Сваю нянавісць да ворагаў проста і спакойна выказаў паэт у вершы «Радзіма»:

Я спакойны юнак, можа нават крыху
сарамлівы ...
Не пакрыўджу і птушкі, бо знаю: ёй
хочацца жыць.
Але тых, хто жадае напасці на край
мой шчаслівы,
Я сваімі рукамі без жалю гатоў задушыць.

Хацелася-б яшчэ шмат сказаць і аб любоўнай лірыцы П. Панчанкі, такой задушэўнай і чыстай. Хацелася-б сказаць аб разнастайнасці мастацкіх прыёмаў, аб багацці рытмікі, аб мастацкай прастаце мовы. Адно ясна: савецкую беларускую літаратуру варта павіншаваць з прыходам новага, таленавітага і спелага паэта-лірыка.

М. КЛІМКОВІЧ.



На выстаўцы «Ленін і Сталін ў народным выяўленчым мастацтве».
На здымку: ВЛАДЗІМІР ІЛЬІЧ І АЛЯКСАНДР ІЛЬІЧ УЛЬЯНАВЫ У ГІМНАЗІЧНЫЯ ГОДЫ.
Карціна работы Г. Е. Пoздневай (Ленінград).

НОВЫЯ БУЙНЫЯ ТВОРЫ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ

За апошні час беларускія савецкія кампазітары напружана працуюць над новымі творамі.

З закончаных твораў трэба адзначыць у першую чаргу чырвонаармейскую сюіту і беларускую танцавальную сюіту Залатарова, сімфанічную паэму аб пагранічніку Лагодзе і санату для валторны Аладава, санату для фортэп'яна Падкавырава, другую сімфонію і сюіту «Калгаснае свята» Шчэглова.

Чырвонаармейская сюіта Залатарова ўяўляе сабою вакальна-аркестровы твор вялікай значымасці. Твор рысуе карціну чырвонаармейскага адпачынку. У першай частцы сюіты чырвонаармейцы праходзяць думкі аб вялікім Сталіне, просьба да таварыша Сталіна прыехаць у часць і пагледзець, як жывуць байцы (словы вядомай песні «Казачая дума аб Сталіне»). У другой частцы ідзе рад жартаўлівых песень і танцаў — чачотка, «Ай, Дунюшка-Дуня», «Таўкачыкі» і плясавая. Другая сюіта ўяўляе сабою беларускія танцы, зробленыя для аркестра. Сюды ўваходзяць: «Бульба», «Крыжачок», «Юрачка», «Мяцеліца» і «Лявоніха».

Сімфанічная паэма Аладава аб пагранічніку Лагодзе малюе карціну жыцця пагранічнай заставы, прыроду, налёты дыверсантаў і геройскую абарону граніцы пагранічнікамі. Саната для валторны — першы твор для гэтага віду інструмента ў БССР.

Другая сімфонія кампазітара Шчэглова напісана ў трох вялікіх частках. Першая частка дае карціну калгаснага жыцця, другая напамінае пра мінулае беларускага народа, трэцяя адлюстроўвае калгаснае свята, калгаснае гулянне, дзе гучаць песні і пляскі шчаслівага беларускага народа. Другая рэч тав. Шчэглова — «Калгаснае свята» — бытавы, жанравы малюнак з пяці невялікіх эпізодаў: збор на гулянне, прыход пагранічнікаў—іх песні і пляскі, прыход групы старыкоў са старажытнымі інструментамі (сапелка, дуда, жалейкі, скрыпкі), расказ пра старыну ў выглядзе працяглай беларускай песні і карагод.

АБЛАСНАЯ НАРАДА САМАДЗЕЙНЫХ МАСТАКОЎ

23—24 лютага ў Менску адбылася абласная нарада самадзейных мастакоў, скульптараў, разчыкаў па дрэву, ткачых і вышывальшчыц. На нарадзе прысутнічала 80 чалавек, з іх 60—з раёнаў.

Нарада заслухала даклады аб падрыхтоўцы да сустрэчы XVIII з'езда партыі, аб выніках першага ўсебеларускага з'езда мастакоў і задачах мастакоў на 1939—40 годы і даклад аб тэматычным плане абласной выстаўкі да XXII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі і ўсебеларускай выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Як выявілася з выступленняў самадзейных мастакоў, многія з іх працуюць ужо над творамі для выставак. Мастак-самавучка з Слуцка тав. Х. І. Кабалкін прывёз з сабою эскіз карціны «Белапалякі грабяць вёску», скульптар-самавучка з Смалявіч тав. М. Ю. Мазо паказаў эскіз скульптуры «Старая Беларусь», скульптар тав. Петрашкевіч (Менск) робіць барэльеф «Ленін і Сталін», вышывальшчыца тав. Л. Н. Скалабанава вышывае партрэт таварыша Сталіна, удзельнік грамадзянскай вайны мастак-самавучка тав. І. В. Шабінскі з Барысава прывёз эскізы карцін «Бой пад Талачынам» і «У дазоры на фінляндскай граніцы», мастак-вышывальшчык тав. Х. І. Каган, які атрымаў нядаўна грамату Вярхоўнага Совета БССР, рыхтуе карціну «Парад на Краснай плошчы ў Маскве» і г. д.

Удзельнікі нарады ўключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва імя XVIII з'езда партыі, узялі на сябе абавязацельства сустрэць XVIII з'езд партыі новымі перамогамі ў галіне выяўленчага мастацтва і звярнуліся да ўсіх работнікаў выяўленчага мастацтва з адозвай — па-ўдарнаму падрыхтавацца да рэспубліканскай і абласной выставак, стварыць высокамастацкія творы, прысвечаныя геніям чалавецтва Леніну і Сталіну.

Рад прафесіянальных мастакоў — тт. Зайцаў, Бембель, Пашкевіч, Красоўскі і інш. узялі шэфства над паасобнымі самадзейнымі мастакамі і абавязаліся аказаць ім канкрэтную дапамогу.

ЮБІЛЕЙ М. П. МУСОРГСКАГА

28 сакавіка споўніцца 100 год з дня нараджэння вялікага рускага кампазітара М. П. Мусоргскага. Для адзначэння гэтай даты створан рэспубліканскі камітэт пад старшынствам начальніка Упраўлення па справах мастацтваў тав. Озірскага. У складзе камітэта 20 чалавек: кампазітары, прадстаўнікі музычных устаноў і тэатраў. Камітэты па правядзенню юбілея ствараюцца таксама ў абласных цэнтрах, музычных установах і арганізацыях.

У музычных установах і канцэртных залах арганізуюцца выстаўкі, прысвечаныя юбіляру, кансультацыі. У музычных установах будуць праведзены лекцыі і гутаркі аб творчасці Мусоргскага з выкананнем яго твораў. Музвучылішчы падрыхтуюць урыўкі з опер Мусоргскага («Барыс Гадуноў», «Хаваншчына», «Сарачынскі кірмаш»).

Філармонія, Кансерваторыя, Тэатр оперы і балета, музвучылішчы Гомеля, Віцебска і Магілева арганізуюць канцэртныя брыгады для выезду на прадпрыемствы і ў калгасы з мэтай папулярызацыі творчасці Мусоргскага. Вызначана 15 выездаў.

24 сакавіка пачнецца пяцідзёнка, прысвечаная М. П. Мусоргскаму. У Менску ў часе пяцідзёнкі сіламі Філармоніі, Тэатра оперы і балета, Кансерваторыі і музвучылішча будуць дадзены пяць канцэртаў з твораў Мусоргскага.

У юбілейныя дні ў Тэатры оперы і балета адбудзецца ўрачыстае пасяджэнне юбілейнага камітэта сумесна з прадстаўнікамі грамадскасці. На пасяджэнні будзе прачытан даклад аб жыцці і творчасці Мусоргскага і дадзен вялікі канцэрт з яго твораў. Аналагічныя пасяджэнні юбілейных камітэтаў адбудуцца ў Віцебску, Магілеве, Гомелі, Мозыры, Бабруйску, Полацку, Оршы, Барысаве і Слуцку.

УДАСКАНАЛЕННЕ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР разам з Дзяржаўнай кансерваторыяй БССР прыступілі да вялікай і вельмі цікавай работы па ўдасканаленню і рэканструкцыі беларускіх народных інструментаў.

На аснове вывучэння прататыпаў беларускіх народных інструментаў, іх канструкцыі, гучання — рад інструментаў будзе рэканструіраван. Мэта рэканструкцыі заключаецца ў тым, каб, захаваўшы каларыт беларускага народнага інструмента, зрабіць яго тэхнічна больш дасканалым і гучным.

Беларуская дудка, напрыклад, будзе мець пасля рэканструкцыі чатыры размеры (пікало, сапрана, альт і тэнар). Тып яе гучання ў аркестры будзе набліжан да флейты. Такое-ж «сямейства» ствараецца і ў народным інструменце — жалейцы, які таксама атрымае гэткія-ж чатыры размеры. Жалейкі будуць двух варыянтаў: з адзіночным і падвойным язычкамі, г. зн. будуць іграць у аркестры ролю кларнетаў і габояў.

Усё гэта значна пашырыць гучанне аркестра народных інструментаў, яго фарбы, тэмбры і г. д.

У ажыццяўленне гэтай работы ўключыліся віднейшыя навуковыя сілы Масквы: прафесар Маскоўскай кансерваторыі, загадчык кафедрай акустыкі Н. А. Гарбузаў, старэйшы навуковы работнік акустычнай лабараторыі П. Н. Зімін, навуковы работнік, лаурэат другога ўсесаюзнага конкурса выканаўцаў К. Д. Юдзін. Вялікую ролю і ініцыятыву ў гэтым пачынанні праявіў загадчык кафедрай народных інструментаў Дзяржаўнай кансерваторыі БССР А. О. Мартынсен.

Рэканструкцыя і ўдасканаленне народных інструментаў будзе мець велізарнае значэнне для росту беларускай нацыянальнай культуры і акажа свой уплыў на развіццё аркестраў народных інструментаў далёка за межамі БССР.

Мяркуецца, што першыя практычныя рэзультаты гэтай работы мы будзем мець яшчэ да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

Палепшыць работу музычных навучальных устаноў

У лютым гэтага года музсектар Упраўлення па справах мастацтваў правёў абследванне работы музычных вучылішчаў і школ Бабруйска, Гомеля, Віцебска, Магілева. Гэтымі днямі адбылася нарада работнікаў, якія прымалі ўдзел у абследванні, сумесна з дырэктарамі музычных устаноў.

Абследванне і нарада выявілі наяўнасць буйных недахопаў у справе падрыхтоўкі музычных кадраў. Найбольш востра стаіць пытанне аб укамплектаванні школ педагагічнымі сіламі, аб сістэме і метадах педагагічнай работы.

Асабліва дрэнна пастаўлена метадычная работа і вучоба ў новых музшколах — у Слуцку, Барысаве і Мозыры. Асноўная прычына—недастатковая кваліфікацыя раду педагогаў, недакладная арганізацыя педагагічнага працэсу. У многіх музшколах вельмі малы кантынгент вучняў.

Нарада вызначыла рад мерапрыемстваў па паляпшэнню пастаноўкі работы ў музычных установах. Асноўная ўвага звернута на папаўненне гэтых устаноў педагагічнымі кадрамі, на перападрыхтоўку апошніх, обмен вопытам работы. Намечаны выезды прафесароў і дацэнтаў Кансерваторыі ў музычныя школы, а таксама выезды педагогаў музшколы і вучылішчаў у Кансерваторыю на паказальныя заняткі.

ПЯЦЬ МЕСЯЦАЎ ПАТРАЧАНА МАРНА

(Пісьмо актораў калгаснага тэатра)

Рагачоўскі калгасна-соўгасны тэатр, урэшце, паказаў гледачу сваю новую работу — спектакль «Егор Булычоў». Падрыхтоўка яго цягнулася аж з верасня 1938 года і ярка паказала безадказнасць кіраўнікоў тэатра ў арганізацыі творчай работы калектыва.

Не ўлічваючы магчымасцей калектыва, кіраўніцтва тэатра (дырэктар тав. Прудскіх, мастацкі кіраўнік тав. Лізункоў) пачало работу над пастаноўкай п'есы «Егор Булычоў». На пяць роляў не было выканаўцаў, але гэта не збянтэжыла кіраўніцтва. Рэпетыцыі ішлі, а выпуск прэм'еры адкладваўся. З папаўненнем-жа трупы тэатра акторамі работу аднавілі спачатку. І такім чынам было марна патрачана каля пяці месяцаў.

У тэатры існуе ўраўнілаўка ў зарплаце актораў. Дырэкцыя ўстанаўляе стаўкі акторам без уліку іх кваліфікацыі. Няма і патрэбных клопатаў аб бытавых умовах актораў. Тав. Прудскіх чамусьці лічыць, што пра бытавыя ўмовы павінен клапаціцца толькі мясцком. Ёсць шмат фактаў і бяздушных, грубых адносін дырэкцыі да актораў.

Аб шматлікіх непаладках у тэатры ведаюць і кіруючыя мясцовыя арганізацыі і Упраўленне па справах мастацтваў. Але яны чамусьці на ўсе гэтыя факты не рэагіруюць.

Калектыў Рагачоўскага калгасна-соўгаснага тэатра патрабуе большай увагі да сябе, патрабуе стварэння нармальных умоў для творчай працы.

Акторы тэатра:
ГАРОБЧАНКА, САВІЧ, ТАЛПЕГА, МАЗУРЭНКА, ВАСІЛЕЎСКІ.

ДА ЧАГО ПРЫВОДЗІЦЬ НЯВЕДАННЕ ЖЫЦЦЯ

Новы зборнік Эдзі Агняцвет («Вершы». ДВБ, 1938) мае сваю асаблівасць. Тэма яго — рэвалюцыйны каляндар і буйныя падзеі з жыцця нашай краіны: ля радыёпрыёмніка ўсхваляваная моладзь слухае гістарычны даклад таварыша Сталіна на VIII з'ездзе Советаў; савецкія лётчыкі пераляцелі праз Полюс у Амерыку; выбары ў Вярхоўны Совет; смерць М. Горкага. Гэтыя вершы сведчаць аб імкненні паэтэсы апяваць самыя жыццёвыя, самыя хвалюючыя праявы і падзеі нашай рэчаіснасці. У гэтым, і толькі ў гэтым, — вартасць зборніка.

Але, каб справіцца з такімі тэмамі, патрабуецца асаблівае веданне жыцця, асаблівая чуласць да яго складаных праяў і змен, патрабуецца ўменне знаходзіць патрэбны ў кожным выпадку вобраз, трапную мастацкую дэталь. Без гэтага паэт стаіць перад пагрозай падмяніць паэзію пераказам газетных артыкулаў. Такая пагроза і стаіць перад Э. Агняцвет, і гэта не цяжка ўбачыць ў цэлым радзе яе вершаў.

Эдзі Агняцвет не заўсёды ўдаецца знайсці яркія і новыя вобразы, і яна карыстаецца літаратурнымі шаблонамі, так званымі «дзяжурнымі» рыфмамі і вобразамі. След недаапрацоўкі і спешкі ляжыць на многіх яе творах. Э. Агняцвет распрацоўвае тэму не ў глыбіню, а ў шырыню, награмаджваючы на паўны тэзіс, на ўзятае палажэнне ўсякі матэрыял. У такіх вершах няма ўнутранага жыцця герояў. Героі на сходах гавораць лозунгамі, адчуванне-ж чалавека, раскрыццё яго ўнутранага свету ў сувязі з важнымі жыццёвымі падзеямі паэтэса абыходзіць. Яна следуе за даўно створанымі літаратурнымі шаблонамі. Шаблоны перашкаджаюць ёй падысці да кожнай тэмы асобна, знайсці яе асаблівасці і сродкі іх выражэння, уласцівыя толькі адной ёй. У такім плане напісана большасць вершаў зборніка. Павярхоўны падыход да паэзіі прыводзіць да абяднення не-

мастацкіх сродкаў, да іх прымітыўнасці. Большая частка вобразаў Э. Агняцвет складаецца з эпітэтаў і параўнанняў пры дапамозе слова «як». Пабудова страфы таксама прымітыўная. Над гэтым Э. Агняцвет трэба сур'ёзна задумацца.

У зборніку эпітэт «малады» ўжываецца бясконца, без усякага густу і меры. Вось напрыклад: «Мой верны край чэкіст вартуе малады». Няўжо слова «малады» у якой-небудзь меры характарызуе тут сутнасць чэкіста? Ці яшчэ: «Але ніпгто не спыніць маладых»; «З вачамі яснымі і маладымі»; «Мне расказаў мой брат, інжынер малады»; «Кожны, як дубок той, стройны, малады». Такая характарыстыка дапрызыўнікаў гучыць безгустоўна. Ці далей: «З смехам радасным і песняй маладой»; «У вачах маладых ярка ззяюць агні»; «Поезд дыхаў, бурліў маладосцю»; «Дыша твар усмешкай маладой». Апошняе ўжо проста недарэчна. Некаторыя гэтыя эпітэты нават дарэчы. Але калі ў кожны верш пачаць без разбору ўстаўляць адны і тыя-ж эпітэты, то ўвесь зборнік будзе выглядаць аднастайным.

Нярoўнадушна паэтэса і да слова «зара». «Па ўсёй зямлі святло яе зары». Тут гаворыцца пра Сталінскую Канстытуцыю да месца і праўдзіва. Але раз ужыўшы вобраз правільна, Агняцвет пачынае ўжываць яго дзесяткі разоў, так што самая ясная зара робіць верш бледным і нецікавым. Пра дзяўчыну: «Такой прыгожай, як вясной зара»; пра піянераў: «Чырвонагальштучных і юных, як зара»; пра Пушкіна: «Узлёт арліных песень смелых, у якіх узыходзіла зара»; пра Іспанію: «Разгарыцца жыцця веснавога зара». Зусім розныя з'явы характарызуюцца аднымі і тымі-ж вобразамі. Зборнік повен паўтораў, а паўторы на фоне беднай вобразнасці і фантазіі, а часам і пры дрэнным густе, робяць на чытача непрыемнае ўражан-

Лёгкасць падыходу да паэзіі прыводзіць да неахайнасці верша, да недакладнасці характарыстык і да радкоў, нічога не выражаючых. А задача паэзіі іменна ў тым, каб самым дакладным вобразам, цікавай думкай усхваляваць сэрца чытача. Ну, што могуць гаварыць чытачу такія радкі пры характарыстыцы вялікага генія рускай літаратуры Пушкіна:

Чалавек, што песнямі звінеў! (?)

Пра некаторых паэтаў можна таксама сказаць, што яны «песнямі звіняць», а, між тым, розніца паміж імі і Пушкіным ёсць.

А вось характарыстыка садоўніка: «Падышоў садоўнік, стройны і высокі». У гэтым-жа самым вершы слова «стройны» Агняцвет ужывае характарызуючы прызыўнікоў: «Кожны, як дубок той, стройны, малады». Якая-ж розніца паміж імі і што гэта дае для ўразумення вобраза садоўніка?

Некаторыя спробы паэтэсы наблізіцца да народнай мовы не далі патрэбных вынікаў. У вершах «Провады» і «Спявай, мая маці» часта ўстаўляюцца словы: «ой», «ды», але гэта песеннасці вершам не надае, бо гэта гучыць неарганічна. Гэта не жывая мова, а змяшэнне сухой мовы з псеўданароднымі шаблонамі. Мова павінна не толькі ўпрыгожваць верш, а дапамагаць раскрываць сэнс тэмы.

Да такога становішча паэтэсу давoдзяць літаратурныя шаблоны, нежаданне самастойна адчуць тэму, знайсці ўласны паэтычны вобраз. А ўласныя вобразы ў паэта будуць толькі тады, калі ён ведае жыццё, калі ён яго непасрэдна адчувае і ўсхваляваны ім. Калі тэма хвалюе паэта, ён у ёй пачынае выражаць сябе — свае думкі і адчуванні, вобразы яго робяцца арганічнымі, індывідуалізіраванымі, непаўторнымі, бо ён у іх выражае непасрэдна самага сябе.

У зборніку «Вершы» змешчана паэма «Фелікс Дзяржынскі». У друку пра яе пісалася дастаткова, недахопы і дадатныя бакі паэмы дэталёва разабраны і разбіраць яе зноў няма сэнсу. Заслуга Агняцвет у тым, што яна ўзялася за такую сур'ёзную і адказную тэму, як паказ рыцара рэвалюцыі. Гэта тэма патрабавала шырыні абагульненняў і яркіх мастацкіх сродкаў. Адказнасць тэмы прымусіла паэтэсу быць больш патрабавальнай да сябе. Уступ у паэму і раздзел аб смерці Фелікса Дзяржынскага гавораць пра магчымасці паэтэсы, гавораць, што пры сур'ёзным падыходзе да паэзіі яна можа вырвацца з зачараванага кола шаблонаў.

У зборніку, вядома, ёсць вершы, больш стройныя па кампазіцыі і лепшыя па сваіх мастацкіх сродках («Таварышу Сталіну», «Шчаслівы дзень», «Памяці Аляксея Максімавіча» і некаторыя іншыя), але справа не ў гэтым, справа ва ўсёй сістэме творчасці. Э. Агняцвет трэба сур'ёзна задумацца над сваім творчым шляхам. Калі яна хоча, каб яе вершы хвалявалі чытача, каб іх чытала і любіла маса, дык яна павінна памятаць, што паэзія — гэта жыццё ў спецыфічных паэзіі вобразах. Трэба ўзбагаціць сябе жыццёвым вопытам, папоўніць унутраны свет новымі ўражаннямі жыцця, жыццё падкажа новыя, арганічныя тэме вобразы. Таксама трэба працаваць над тэхнікай верша.

У Э. Агняцвет у якасці дадатнага боку яе творчасці чытач знаходзіць актуальнасць распрацоўваемых тэм. Гэта добра. Але актуальнасць сама па сабе яшчэ не заслуга, калі за ёй аўтар будзе хаваць сваё няведанне жыцця і нізкаякасную творчасць. Пра гэта Эдзі Агняцвет не варта забываць. Зборнік «Вершы» аб'ядноўвае ў сабе творчасць Э. Агняцвет за 1934 — 37 гады. Для маладога паэта, калі яшчэ не ўстанавіўся ўласны голас і ідуць пошукі ў гэтым напрамку, — вершы 2—3 гадовай даўнасці да некаторай ступені можна ўжо лічыць пройдзеным этапам. Некаторыя вершы Э. Агняцвет за апошні год — не ўвайшоўшыя ў гэты зборнік «Таварышу Молатаву», «Саколік» і інш. — гавораць пра большую стройнасць кампазіцыі і большую мастацкую якасць. Але Э. Агняцвет трэба больш рашуча пераглядзець сваю творчасць, смялей аслабаняцца ад усяго шаблоннага, не паэтычнага, толькі тады яе творчасць будзе сапраўды хвалюючай і жывой.

АНДРЭЙ УШАКОЎ.

ГАСТРОЛІ СЛУЦКАГА КАЛГАСНА-СОЎГАСНАГА ТЭАТРА

Слуцкі калгасна-соўгасны тэатр у пачатку сакавіка выязджае на гастролі ў раёны Менскай вобласці—у Старыя Дарогі, Асіпавічы, Пухавічы, Чэрвень, Смілавічы, Смалявічы, Бягомль.

У рэпертуары тэатра — «Платон Крэчэт» Карнейчука, «Слава» Гусева, і «Цярэнцій Іванавіч» Свірына.

У Слуцк тэатр вернецца ў канцы красавіка.

ГРАМАФОННЫ ЗАПІС БЕЛАРУСКІХ ТВОРАЎ

У пачатку сакавіка ў Менск для запісу беларускіх музычных твораў прыязджае з Масквы брыгада фабрыкі гуказапісу. Вызначана запісаць да 60 твораў: урыўкаў з беларускіх опер, сімфанічнай музыкі і фальклору.

„ПАРТЫЗАНЫ" К. КРАПІВЫ НА ШКОЛЬНАЙ СЦЭНЕ

Драмгурток вучняў старэйшых класаў Талькаўскай сярэдняй школы Пухавіцкага раёна паставіў у дні 21-й гадавіны Чырвонай Арміі п'есу К. Крапівы «Партызаны».

Спектакль прайшоў у школе з вялікім поспехам.

А. ПАРАГОН.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № К—900.